Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

30 САКАВІКА 2021 г. АЎТОРАК № 58 (29427)




ДАСЛЕДЧЫКІ АСАБЛІВАГА НАДВОР'Я 4

МАРЫЯ І ЯЕ «БАЯВАЯ СЯБРОЎКА» 5



## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй ШВЕД, генеральны пракурор:**

*«Генеральнай пракуратурай на падставе матэрыялаў, дадзеных Камітэтам дзяржаўнай бяспекі і МУС, у дачыненні да Ціханоўскай і ўдзельнікаў так званай ініцыятывы BYPOL распачата крымінальная справа за падрыхтоўку акта тэрарызму арганізаванай групай па арт. 289 Крымінальнага кодэкса. Названыя асобы некалькі дзён таму спрабавалі здзейсніць выбухі і падпалы на тэрыторыі сталіцы і іншых гарадоў. Затрыманы з доказамі злачынства грамадзянін Маляйчук ужо даў паказанні пра арганізатараў і ўдзельнікаў тэракта... Заяўляю, што мы прымем усе меры для таго, каб ні адна асоба, якая замахваецца на правапарадак, не ўхілілася ад строгай адказнасці».*

# Каменны каштарыс





Пачынаецца рэканструкцыя з рэстаўрацыяй аб'екта сядзібна-палацавага комплексу Агінскіх у Залессі Смаргонскага раёна — будынка былой канюшні, які шмат гадоў прастаяў без догляду. Кансервацыйнымі работамі займаецца смаргонскі будаўніча-мантажны трэст № 41.

Муляры-стропальшчыкі гэтага прадпрыемства Віктар МАЗАЙ і Канстанцін ГУЛЕЦКІ падпісваюць камяні старой муроўкі, каб падчас рэстаўрацыі кожны каменьчык пакласці на сваё спрадвечнае месца.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

• **Прадпрыемствы Гомельскай вобласці на трацціну павялічылі экспарт прадукцыі ў КНР.**

• ФПБ: на адну праверку прыходзіцца ў сярэднім 16 парушэнняў аховы працы.

• **Камісія па прадухіленні легалізацыі злачынных даходаў створана ў Беларусі.**

• Зацверджана дзяржпраграма для транспартнага комплексу на пяцігодку.

• **Комплекснае добраўпарадкаванне Добруша пачнецца ў гэтым годзе.**

• У Мінску аўтапаркоўкі ўнутры другога кальца да канца 2022 года зробяць платнымі.

Каб памяталі

# Кожны салдат павінен быць на ўліку

Магілёўскія пошукавікі ствараюць банк даных адзіночных магіл чырвонаармейцаў, якія дагэтуль не ўзятыя на дзяржаўны ўлік



**Штогод пошукавікі вяртаюць страчаныя імёны герояў вайны і займаюцца перапахаваннем іх астанкаў. Але адна справа, калі пахаванні стыхійныя і былі ўстаноўлены пошукавікамі падчас разведкі. І зусім іншая, калі забітых чырвонаармейцаў хавала насельніцтва. І многія з тых магіл дагэтуль застаюцца няўлічанымі. Бо людзі нікуды не звярталіся, самі даглядалі гэтыя пахаванні. Зараз тыя сведкі або вельмі старыя, каб і далей займацца гэтай высакароднай справай, або наогул пайшлі з жыцця. І добра яшчэ, калі салдацкія магілы працягваюць даглядаць іх дзеці або ўнукі. У іншым выпадку такая памяць асуджана на забыццё. У Магілёўскай вобласці заклапочаныя тым, каб гэтага не адбылося.**

СТАР. 7

Кампетэнтна

**Таццяна ЛУГІНА:**

# «Хачу, каб людзі, якія стаяць у другой шарэнзе за мной, разумелі, што мы робім адну справу»



**Тавары беларускай лёгкай прамысловасці часта атрымліваюць шмат кампліментаў ад гасцей краіны, найперш — за якасць. Ад нашага пакупніка, наадварот, гучыць нямала крытыкі — то за дызайн, то за цану. Але, несумненна, у кожнага ёсць свой любімы беларускі вытворца — бялізны, трыкатажу, абутку ці вопраткі, рэчы якога і ва ўласным гардэробе знойдуцца, і сябрам парэкамендуюцца. Старшыня Беларускага дзяржаўнага канцэрна па вытворчасці і рэалізацыі тавараў лёгкай прамысловасці Таццяна ЛУГІНА з тых кіраўнікоў, хто пагаджаецца з крытыкай, і аб праблемах, здаецца, разважае больш ахвотна, чым аб поспехах. А галоўнае — дзейнічае і імкнецца праблемы вырашыць. Пра тое, якім павінен быць менеджар у дзяржсектары, каб зрабіць прадпрыемства паспяховым; ці выбірае сёння моладзь беларускае адзенне і прадукцыя якога прадпрыемства амаль цалкам адпраўляецца на экспарт, мы паразмаўлялі з кіраўніком галіны.**

СТАР. 6

ISSN 1990 — 763X

З першых вуснаў

# «Вельмі хочацца розным сілам — перадусім знешнім — распаліць тут абстаноўку»

## Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў нараду па актуальных пытаннях грамадска-палітычнай сітуацыі ў краіне

**Кіраўнік краіны запрасіў сілавы блок на сустрэчу абмеркаваць, якім чынам будуць далей працаваць над забеспячэннем унутранай і знешняй бяспекі, што неабходна зрабіць, выходзячы з бягучай абстаноўкі.**

Ён нагадаў свае словы, што спакойнага жыцця ў краіне не будзе. «Можа быць спакайней, можа быць больш вострая сітуацыя, але абсалютнага спакою ў краіне ніколі не будзе, таму што вельмі хочацца розным сілам — перадусім знешнім — распаліць тут абстаноўку», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, за мяжой «рэжысёры» падзей па дэстабілізацыі абстаноўкі ў Беларусі змяніліся. «Некаторыя каналы, што раней вадзілі па Мінску пратэстуноў, ад гэтага адмовіліся. З'явіліся больш радыкальныя накшталт распіяранага BYPOLа, дзе паўтара-два дзясяткі былых былых байцоў ваеннаслужачых. Цяжка іх назваць ваеннаслужачымі. Вы бачыце гэтыя заклікі да радыкалізацыі», — заявіў Прэзідэнт.

Ён адзначыў добрую работу міліцыі, асабліва Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй. «Хлопцы — малайцы. Раскрылі чарговае злачынства тэрарыстычнага кірунку. Трэба, Іван Уладзіміравіч (Кубракоў, кіраўнік МУС. — «**Зв.**»), усіх, хто ўдзельнічаў у гэтай аперацыі, прадставіць да дзяржаўных узнагарод. Яны гэта заслужылі. Яны абаранілі велізарную колькасць людзей, якія маглі пацярпець», — дадаў Прэзідэнт.

Ён акцэнтаваў увагу, што такія падзеі — добры ўрок для людзей, якія займаюцца ўнутранай бяспекай і забяспечваюць знешнюю абарону краіны.

Прэзідэнт папрасіў міністра абароны коратка далажыць аб сітуацыі на граніцы, а старшыню КДБ і кіраўніка МУС — пра абстаноўку ўнутры краіны, перспектывы развіцця падзей і магчымыя меры па нейтралізацыі пагроз.

«Тое, што ў нас ідзе перафарматаванне дзеянняў пратэстуноў і збеглых, мы гэта бачым. Павінен сказаць, ***што мы ніколі не дапусцім таго, каб наш народ баяўся выйсці на вуліцы. Гэтага дапусціць мы не можам. Не маем права.*** Гэта характэрна найперш для горада-героя Мінска», — сказаў кіраўнік краіны.

Ён звярнуўся да ўпаўнаважанай па горадзе Мінску, старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай з просьбай сачыць за парадкам і працаваць у такім рэжыме, як і раней.

«Людзі ў нас, нават сярод пратэстуноў, выдатна бачаць, і яны кажуць, што нехта «бабкі косіць» за мяжой. Зразумела, хто сядзіць на гэтых патоках. Людзі кажуць: «Чаго вы нас на вілы кідаеце? А самі там грошы па кішэнях раскладваеце». Яны адчуваюць, што іх проста падстаўляюць. І мы гэта бачым унутры краіны», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён заявіў пра неабходнасць размаўляць з людзьмі, але не з усімі. ***«Неабходна працаваць жорстка з тымі, хто бярэцца за зброю, прывозіць сюды выбухоўку, рыхтуе яе*** і спрабуе ці то ў смеццевых кантэйнерах, ці ў вогнетушыцелях стварыць гэтыя выбухі. З гэтымі мы размаўляць не будзем і лічыць да трох таксама не будзем. Але асноўная маса людзей — тыя, з кім неабходна размаўляць. Зразумеюць, пачуюць яны нас ці не — іх справа», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Ён адзначыў, што валодае сітуацыяй у краіне, але асабліва хоча пачуць пра перспектывы развіцця падзей, бо яны значна ўплываюць і на эканоміку.

***«Мы жывём не ў закрытым свеце, і сваю эканамічную бяспеку мы павінны забяспечыць самі.*** Нам няма на каго спадзявацца. Абсалютна няма на каго. У кожнага свае праблемы і свае інтарэсы. Сваіх сяброў мы ведаем, але і яны з-за пандэміі, падзення эканамічнага развіцця не маюць сёння тых магчымасцяў, на якія мы маглі разлічваць раней», — рэзюмаваў кіраўнік краіны.

Марыя ДАДАЛКА.

### Каментарый у тэму

Пра вынікі нарады журналістам расказаў дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ.

У першую чаргу, як паведаміў суразмоўнік, кіраўніку краіны далажылі пра абстаноўку на знешнім контуры, якія адбываюцца вучэнні, якія створаны ваенныя групоўкі ў Польшчы, Літве, Латвіі.

«На жаль, мы бачым, што тэматыка вучэнняў, што праводзяцца на тэрыторыі побач з сумежнымі краінамі, не мае абарончай накіраванасці — разглядаюцца пытанні агульнакрызіснага рэагавання, наступальная тэматыка адпрацоўваецца», — сказаў Аляксандр Вальфовіч.

Абмяркавалі на нарадзе, як ён адзначыў, і пытанні грамадска-палітычнай сітуацыі ў Беларусі, — у прыватнасці мерапрыемствы праваахоўнікаў па стабілізацыі сітуацыі, падтрымкі правапарадку ў краіне.

«Мы маглі ўсё назіраць і па інтэрнэт-рэсурсах, і ў сродках масавай інфармацыі (у тым ліку недзяржаўных СМІ), што рознымі дэструктыўнымі сіламі былі прыняты спробы па дэстабілізацыі абстаноўкі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь — па правакаванні народа Беларусі, падняцця пратэснай масы, арганізацыі масавых мерапрыемстваў. Кіраванне ўсімі гэтымі мерапрыемствамі здзяйснялі дзеячы, якія не знаходзіліся на тэрыторыі нашай краіны, так званыя лідары — Ціханоўская, Латушка, службовыя асобы (здраднікі, па-іншаму не назаву), якія ўваходзяць у BYPOL», — дадаў дзяржаўны сакратар.

Ён акцэнтаваў: галоўная задача, пастаўленая на нарадзе Прэзідэнтам, — забяспечыць спакой грамадзян.

Аляксандр Вальфовіч заявіў, што сістэма нацыянальнай бяспекі выконвае свае задачы, у тым ліку і па папярэджанні тэрарыстычных пагроз.

«Мы маем даныя пра тых нягоднікаў, яны перапісаны, маюцца іх спісы. І верагодна, у найбліжэйшы час мы спісы здраднікаў, «кіраўнікоў» апублікуем, каб іх таксама ведалі. Яны ж стварылі «кнігу карнікаў», у якую запісалі сумленных людзей, патрыётаў. Чаму б нам не стварыць такую ж кнігу, дзе будуць пералічаны людзі, якія кінулі сваю краіну, збеглі за мяжу, спрабуюць сутыкнуць народ?» — адзначыў дзяржаўны сакратар. «Беларусы заўсёды жылі мірна. Я ўпэўнены, тая сістэма, што створана сёння, забяспечыць правапарадак на тэрыторыі нашай краіны», — рэзюмаваў ён.

Блізкая ўлада

# Вакцынацыя і сітуацыя на акумулятарным заводзе

## Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА правёў прамую лінію

**Праблемы ўзнімалі самыя розныя — ад уладкавання навеса на прыпынку да абазначэння на галоўнай магістралі напрамку праезду да мемарыялаў.**



Фота БелТА.

Пачалася вакцынацыя ад COVID-19, і не ўсе задаволены яе тэмпамі, а таксама магчымасцямі зрабіць прышчэпку тут і цяпер. Таму не дзіва, што ў ліку першых і прагучала такое пытанне. Аўтар звароту атрымаў падрабязнае тлумачэнне. Вядома, ахапіць працэсам імунізацыі вялікую колькасць людзей адразу немагчыма. У другой палове красавіка пачнецца вакцынацыя ўсіх ахвотных.

Жыхарка вёскі Харытоны Брэсцкага раёна, маці траіх дзяцей, паскардзілася, што тыя ў чаканні школьнага аўтобуса вымушаны стаяць пад дажджом, снегам, хавацца ад ветру толькі пад уласнымі капюшонамі. Аўтобус забірае іх на скрыжаванні каля ўзбочыны, паблізу ніякіх крытых прыпынкаў няма. Старшыня аблвыканкама паабяцаў шматдзетнай маці, што хутка навес на ўскрайку вёскі будзе.

Маці-адзіночка з Пінска пасля званка на прамую лінію атрымала надзею на працаўладкаванне. Жанчыне ў гэтым сэнсе не шанцавала, не магла знайсці пастаянную работу некалькі гадоў, а часовая занятасць у яе выпадку — справа ненадзейная. А кобрынскія адказныя асобы атрымалі даручэнне па працаўладкаванні дзяўчыны-інваліда, якая мае пасведчанне аператара ПЭВМ.

На гэты раз нямала даручэнняў атрымалі прадстаўнікі «вертыкалі» ў розных раёнах. Напрыклад, у фермера з Ляхавіцкага раёна забралі ўчастак зямлі на карысць новага інвестара, а выдзеліць новы, раўназначны, не паклапаціліся. Цяпер, трэба думаць, выправяць хібы. А фермер з Брэсцкага раёна, які гадуе слімакоў для пастаўкі на экспарт, пасля размовы з губернатарам атрымаў спадзяванне, што зможа купіць камбікорм па фіксаванай цане.

Жыхары вобласці ўзнімалі пытанне захавання памяці пра ахвяр вайны. Як вядома, на тэрыторыі Бярозаўскага і Жабінкаўскага раёнаў ёсць мемарыялы «Бронная Гара» і «Драмлёва». Да помнікаў масавай гібелі людзей не вельмі проста знайсці дарогу не толькі турыстам, але часам нават і мясцовым жыхарам. На трасе М1, напрыклад, няма ніякіх паказальнікаў да памятных мясцін. Але ж пытанні ўстаноўкі паказальнікаў ці інфармацыйных стэндаў не ўваходзяць у кампетэнцыю мясцовых органаў улады. «Вывучу гэтае пытанне. Яно мне цікавае, — сказаў Юрый Шулейка. — Калі ў краіне ёсць аналагічныя прыклады, значыць, будзем шукаць вырашэнне праблемы».

Адказваючы на пытанне жыхаркі Брэста, губернатар растлумачыў сітуацыю з акумулятарным заводам. Сёння завод працуе: «Усе паказчыкі па экалогіі адпавядаюць нарматывам, выкіды не перавышаюць і палову дапушчальнага. Гэта і стала падставай для пуску прадпрыемства. Завод знаходзіцца на жорсткім кантролі, ніякай пагрозы не ўяўляе. Вынікі маніторынгу даступныя ўсім на сайце прадпрыемства».

Вялікая колькасць зваротаў узятая на кантроль, пытанні будуць вырашацца ў хуткім часе.

Яна СВЕТАВА.

# Звароты падказалі парадак дня для пасяджэння аблвыканкама

**Асаблівасцю прамой лініі старшыні Віцебскага аблвыканкама Мікалая ШАРСНЁВА стала вялікая колькасць зваротаў наконт дрэннага стану дарог. Таму губернатар паведаміў, што гэтае пытанне ў найбліжэйшы час стане тэмай для абмеркавання на пасяджэнні аблвыканкама.**



Фота БелТА.

Грэйдараў у вобласці катастрафічна не хапае, ямачны рамонт, тым больш зроблены наспех, непрафесійна, «каб не скардзіліся», толькі выклікае яшчэ большую незадаволенасць грамадзян, гадамі абяцаюць, але ў выніку ніякіх змен... Гэтыя і іншыя дарожныя праблемы патрабуюць сістэмнага аналізу і прыняцця мер для вырашэння. Як пракаменціраваў адзін са зваротаў старшыня Віцебскага райвыканкама Генадзій Сабыніч, з усіх 900 кіламетраў унутрыраённых дарог толькі 150 км — з асфальтаваным пакрыццём.

Традыцыйна шмат зваротаў было наконт праблем ЖКГ. Жыхарка Віцебска паведаміла пра ваду з-за прарыву каналізацыі ў падвале шматпавярхоўка. Там «міні-басейн» доўгі час. А камунальнікі замест таго, каб адказна падысці да ліквідацыі наступстваў надзвычайнага здарэння, праінфармавалі заяўніцу, што, маўляў, «усё добра». У гарвыканкаме паабяцалі ўзяцца за справу адразу ж...

А падчас размовы з яшчэ адной віцяблянкай Мікалай Шарснёў паабяцаў на наступным тыдні зайсці ў яе кватэру на дзявятым паверсе дома, узведзенага ў 1985-м, каб на свае вочы ўбачыць праблемы з-за дрэннай вентыляцыі ў жыллі. І на месцы разам са спецыялістамі будзе абмеркаванне таго, чым жа можна дапамагчы. Тым больш што, як адзначыў начальнік галоўнага ўпраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі аблвыканкама Юрый Дзядзёла, такая праблема — не рэдкасць у дамах, пабудаваных некалькі дзясяткаў гадоў таму.

Па-ранейшаму на прамыя лініі тэлефануюць тыя, хто лічыць закрыццё школ у вёсачках няправільным падыходам. Гэтым разам выказала незадаволенасць жыхарка Талачынскага раёна. Чаму ў Серкавіцах закрываюць базавую школу, а вучняў пераводзяць у іншую? Начальнік галоўнага ўпраўлення па адукацыі Віцебскага аблвыканкама Дзмітрый Хома растлумачыў, што да ўстановы адукацыі, дзе будуць вучыцца дзяцей і з Серкавіцаў, усяго 7 км. Яна паraўнальна ў лепшым стане. Губернатар даручыў практыкаваць не проста сустрэчы з бацькамі, калі іх дзеці будуць вучыцца не там, дзе раней. Не стане лішнім адвезці тат і мам у суседнюю школу, паказаць ім усё, акрэсліць перспектывы.

А жанчыну з прыгранічнага з Расіяй гарадскога пасёлка Езярышча Гарадоцкага раёна турбуе тое, што ўрачэбная лабараторыя будзе ў іншым будынку. Кіраўнік галоўнага ўпраўлення па ахове здароўя Віцебскага аблвыканкама Міхаіл Вішнявецкі растлумачыў, што пераезд — толькі ў мэтах эканоміі фінансавых сродкаў на аплату камунальных паслуг. Усе плошчы медустановы не выкарыстоўваюцца па прызначэнні, таму аказваць дапамогу будуць у іншых метрах.

Кіраўнік абласной вертыкалі ўлады, каб упэўніцца ў тым, што будзе зроблена як мае быць, трымае прыняцце мер на асабістым кантролі. У некаторых выпадках просіць старшынь райвыканкамаў і гарвыканкамаў асабіста яму далажыць пра рэагаванне на заявы, скаргі, прапановы...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

# ПРАВА НА ПЕНСІЮ

## У краінах ЕАЭС будуць суміраваць стаж працы

**Аб пенсійным пагадненні паміж краінамі Еўразійскага эканамічнага саюза расказала памочнік старшыні Калегіі ЕЭК Ія МАЛКІНА ў інтэрв'ю праграме «Тыдзень» на тэлеканале СТБ.**

Пагадненне аб пенсійным забеспячэнні працоўных краін Еўразійскага эканамічнага саюза ўступіла ў сілу з 1 студзеня 2021 года. Дакумент вызначае парадак і механізм экспарту пенсіі з адной дзяржавы саюза ў іншую, прадугледжвае сумаванне стажу працы ў дзяржавах ЕАЭС для вызначэння права на пенсію.

«Напрыклад, беларускі грамадзянін, адпрацаваўшы ў Расіі некалькі гадоў, з 2021 года зможа прэтэндаваць на пенсію за гэты перыяд, калі ён заявіць аб яе афармленні ў Беларусі. Прычым абсалютна не важна, у якім пункце саюза чалавек прэтэндуе на атрыманне пенсійнага забеспячэння. Прынцыпова важным з'яўляецца тое, што ў сукупнасці ў працоўны стаж для налічэння пенсіі афармляюцца ўсе перыяды работы, якую непасрэдна грамадзянін ажыццяўляў у любой з дзяржаў — членаў ЕАЭС», — сказала Ія Малкіна.

Акрамя таго, урэгулявана пытанне медыцынскага агляду працоўных у тым выпадку, калі яны прэтэндуюць на атрыманне пенсіі па інваліднасці.

«Па сутнасці, гэта пагадненне рэалізуе адзін з прыярытэтаў еўразійскай эканамічнай інтэграцыі — свабоду перамяшчэння грамадзян. Мы разлічваем, што ў далейшым гэта ў значнай ступені дазволіць прыцягваць у адну дзяржаву саюза найбольш кваліфікаваных спецыялістаў, якія запатрабаваны ў той ці іншы перыяд часу, з іншай дзяржавы — члена ЕАЭС, — адзначыла памочнік старшыні Калегіі ЕЭК. — Гэта, вядома, не адзіны крок, які павінен быць зроблены для таго, каб максімальна адкрыць межы для перамяшчэння грамадзян, але неабходны».

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Добрая справа

# Зробленыя на суботніку сродкі пойдуць на мемарыял

**На Гомельшчыне каля 300 тысяч чалавек выйшла на абласны суботнік. Навядзенне парадку пасля зімы ў рэгіёне спалучылі з падтрымкай народнага патрыятычнага праекта. Так, зробленыя на суботніку сродкі — унёсак жыхароў вобласці ў будаўніцтва мемарыяла партызанскай славы.**



— Сродкі абласнога суботніка будуць накіраваны на рэканструкцыю мемарыяла, які знаходзіцца на тэрыторыі Гомельскага раёна. Гэта «Партызанская крынічка». Мэта і задача такога патрыятычнага руху — нагадаць грамадзянам, нашай моладзі аб ваенных падзеях, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі, што дзякуючы подзвігу воінаў мы сёння жывём у свабоднай краіне, — адзначыў падчас удзелу ў суботніку **намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй БАРАНОЎСКІ.**

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**Фота Марыны ВАСІЛЬЕВАЙ.**

Новыя кнігі

# «Падарожжа па родным краі»:

## бібліятэка радзімазнаўчых вандровак

**Серыя кніжнага выдавецтва «Беларусь», прысвечаная розным рэгіёнам Беларусі, папоўнілася навінкамі.**

У зборніку нарысаў «Драгічыншчына. Харaство венерынага чаравічка» Алесь Марціновіч расказвае пра адзін з найцікавейшых куточкаў Берасцейшчыны. Гісторыя Драгічыншчыны — даўні горад Здзітаў-на-Ясельдзе, вёска Таракань — некалі рэзідэнцыя кіраўніка базыльянскага ордэна, крэпасць Жабер, перад якой было бяссільнае войска Карла XII, адзіны ў Беларусі апорны пункт геадэзічнай Дугі Струвэ і палескае жыццё Элізы Ажэшкі. Сённяшняя Драгічыншчына — адзіны ў свеце музей фартушкоў, непаўторнасць мясцовых гаворак, багатая матэрыяльная і духоўная культура. Усё гэта і шмат іншых цікавінак вы знойдзеце на старонках кнігі лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Алеся Марціновіча. Дарэчы, ён выдаў у згаданай краязнаўчай серыі і кнігі пра Капыльшчыну і Случчыну.

І другая навінка ў праекце «Падарожжа па родным краі» — зборнік нарысаў дасведчанага журналіста, публіцыста, супрацоўніка часопіса «Беларуская думка» Сяргея Галоўкі «Стаўбцоўшчына: нататкі пра людзей і гісторыю». У выданні чытач даведаецца пра мясціны, звязаныя з жыццём і дзейнасцю Якуба Коласа, Янкі Купалы, Уладзіслава Сыракомлі, Кандрата Крапівы, Каруся Каганца, Янкі Лучыны і іншых яркіх асоб беларускага прыгожага пісьменства, беларускага асветніцтва.

У краязнаўчай кніжнай серыі раней выходзілі зборнікі нарысаў, эсэ, артыкулаў пра Брэст, Паставы і Пастаўшчыну, Пухавіччыну, Чэрвеньшчыну, іншыя мясціны Беларусі. Звярніце ўвагу на гэтыя віртуальныя вандроўкі па Беларусі — упэўнены, што вы распрацуеце ўласныя турыстычныя маршруты па нашай Айчыне і не пашкадуеце часу, каб наведацца ў мясціны, пра якія расказваюць дасведчаныя аўтары.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Суэцкі канал разблакіравалі



«Егіпцянам удалося пакласці канец крызісу з суднам Ever Given у Суэцкім канале, нягледзячы на мноства тэхнічных цяжкасцяў, якія суправаджалі гэты працэс», — напісаў прэзідэнт Егіпта Абдэль Фатах ас-Сісі ў «Твітэры». Пры гэтым ён падзякаваў усім жыхарам краіны, якія прымалі ўдзел у гэтай аперацыі. Прэзідэнт дадаў, што цяпер сусветная супольнасць можа быць упэўнена ў бесперашкоднай транспарціроўцы грузаў праз Суэцкі канал. Раней дырэктар Suez Canal Authority (SCA) Усама Рабіа заявіў, што прыкладна тры з паловай дня сыдзе на аднаўленне нармальнага прапускнога рэжыму. У чарзе больш чым 360 суднаў. Дакладныя прычыны аварыі дагэтуль невядомыя. «Ёсць шмат фактараў: моцны вецер і пясчаная бура маглі стаць прычынай інцыдэнту, але не галоўнай. Да таго, што здарылася, хутчэй, магла прывесці тэхнічная памылка або чалавечы фактар», — заўважыў кіраўнік SCA. Паводле слоў Усамы Рабіа, расследаванне працягнецца.

### Эксперты СААЗ палічылі малаверагоднай версію штучнага паходжання COVID-19

Эксперты Сусветнай арганізацыі аховы здароўя і кітайскія навукоўцы па выніках сумеснага даследавання прыйшлі да высновы, што найбольш верагодны сцэнарый пачатку пандэміі COVID-19 — пераход віруса SARS-CoV-2 ад лятучай мышы да чалавека праз яшчэ нейкую жывёлу-пасярэдніка. Аб гэтым паведаміла Associated Press са спасылкай на праект выніковага даклада, які быў атрыманы ад дыпламатычнай крыніцы ў Жэневе. Дакумент складзены па выніках місіі, якая працавала ва Ухані з сярэдзіны студзеня да сярэдзіны лютага. Даследчыкі спрабавалі прасачыць распаўсюджванне каранавіруса ў горадзе, дзе ўпершыню была апісана новая інфекцыя. Усяго экспертамі названы чатыры сцэнарыі пачатку пандэміі SARS-CoV-2. Варыянт з уцечкай віруса з сакрэтнай лабараторыі аўтары дакумента назвалі вельмі малаверагодным. Удзельнікі місіі прапанавалі працягнуць даследаванне ўсіх іншых магчымых сцэнарыяў.

### Японію і Карэю накрыла пясчаная бура

Велізарнае воблака з вельмі дробнага пяску накрыла ўсю тэрыторыю Рэспублікі Карэя, а таксама паўднёва-заходнія раёны Японіі, паведаміла ТАСС. Воблака прынесла заходнім ветрам з пустынных раёнаў Кітая і Манголіі. Сёння пясчаная бура дасягнула і паўночна-ўсходніх раёнаў вострава Хансю, уключаючы Токіа. Метэаралагічнае ўпраўленне Японіі афіцыйна папярэдзіла пра пагаршэнне бачнасці на дарогах і заклікала вадзіцеляў аўтамабіляў да павышанай пільнасці. Паўднёвакарэйскія ўлады заклікалі грамадзян з рэспіраторнымі і сардэчна-сасудзістымі захворваннямі, а таксама дзяцей без крайняй неабходнасці не выходзіць на вуліцу. Папярэджанне аб пыльнай буры дзейнічае для ўсіх рэгіёнаў краіны, акрамя паўднёвага вострава Чэджуда.

Надвор'е

# КРАСАВІК СУСТРЭНЕМ ЯРКА

## Але добрае цяпло (да плюс 21 градуса) будзе чаргавацца істотным пахаладаннем (уначы — нават з мокрым снегам)

**Нягледзячы на гэта, у цэлым сёлетні сакавік на 1-2 градусы акажацца цяплейшым за кліматычную норму. Такімі чакаюцца і апошнія дні месяца. Паветраныя масы з Заходняй Еўропы прынясуць дадатковую порцыю цяпла і вільгаці. Дажджы ў асноўным будуць невялікімі і істотна не зменяць сакавіцкі дэфіцыт ападкаў, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У сераду ўначы і раніцай месцамі па Мінскай і Віцебскай абласцях, а па Магілёўскай і Гомельскай абласцях на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы. У нізкіх месцах і паблізу вадаёмаў будуць згушчацца слабыя туманы. У дзень франтальны раздзел пакіне тэрыторыю краіны, у асноўным абыдзецца без ападкаў. Вецер чакаецца паўднёва-заходні, заходні ўмераны, удзень парывісты. Тэмпература паветра ў начныя гадзіны — плюс 4—9 градусаў, удзень — плюс 13—19 градусаў, па паўднёвым захадзе месцамі да 21 цяпла.

1 красавіка будзе цёпла, а вось на наступны дзень магчымыя сюрпрызы. Так, у чацвер чакаецца пераменная воблачнасць. Уначы па поўначы, а ўдзень месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні, заходні ўмераны, удзень у асобных раёнах парывісты. Тэмпература паветра ў начныя гадзіны — плюс 4—9 градусаў, у дзённыя — плюс 12—19 градусаў, па поўдні краіны месцамі да 21 цяпла. У паўночных раёнах дажджавыя аблокі не дадуць слупкам тэрмометраў падняцца вышэй за 8—11 градусаў.

Надвор'е пачне жартаваць з намі ў пятніцу. У гэты дзень праз тэрыторыю краіны перамесціцца халодны франтальны раздзел. Вецер зменіцца на паўночны, паўночна-заходні, які прынясе ў паўднёвых шыротах халаднаватае паветра. Чакаецца воблачна з праясненнямі. Уначы на большай частцы тэрыторыі, удзень месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад мінус 1 да плюс 6 градусаў. Удзень паветра прагрэецца да 5—10 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у суботу захаваецца халаднаватае надвор'е. Аблокаў будзе шмат. Уначы месцамі, раніцай і ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Тэмпература паветра ўначы будзе ад 3 марозу да плюс 2 градусаў, удзень — 3—9 цяпла. Паўночна-заходні парывісты вецер узмоцніць адчуванне холаду. Вось вам і цёплы красавік, якому верыць прымаўка не раіць.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Злоўлена!

# Радыяцыйная абстаноўка ў норме

## А літоўскія калегі інфармацыяй не валодаюць

**Калі коратка, прыкладна так Рэспубліканскі цэнтр па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды (Белгідрамет) адрэагаваў на заяву кіраўніка Цэнтра радыелагічнай бяспекі Літвы Юліуса Жылюкаса ў эфіры літоўскага тэлеканала LRT TV аб адключэнні станцый радыяцыйнага кантролю па ўсёй краіне 7 сакавіка, падкрэсліваючы, што радыяцыйная абстаноўка ў раёне БелАЭС заставалася ў норме. Такая інфармацыя размешчана на сайце Белгідрамета.**

«7 сакавіка 2021 года аўтаматычныя пункты вымярэння магутнасці дозы гама-выпраменьвання (АПА) ведамаснай аўтаматызаванай сістэмы радыяцыйнага кантролю (АСКРО) у раёне размяшчэння Беларускай АЭС функцыянавалі ў штатным рэжыме. Збояў перадачы даных ад АПА ў Цэнтр рэагавання Белгідрамета не было», — гаворыцца ў паведамленні.

Пры гэтым кожныя 10 хвілін даныя магутнасці дозы гама-выпраменьвання ад дазіметрычных датчыкаў паступалі на сервер АСКРО, перавышэнняў над фонавымі значэннямі не зафіксавана. «Узроўні магутнасці дозы гама-выпраменьвання 7 сакавіка на ўсіх АПА знаходзіліся ў інтэрвале 0,05-0,11 мкЗв/ч, такі ж дыяпазон значэнняў назіраўся ў астатнія дні сакавіка 2021 года і раней», — дадалі ў ведамстве.

Таксама адзначаецца, што Белгідрамет перадае даныя АСКРО ў рэжыме анлайн толькі зацікаўленым дзяржаўным органам Беларусі, адказным за рэагаванне ў выпадку надзвычайных сітуацый, у сувязі з чым літоўскія калегі не маглі валодаць інфармацыяй пра тое, што «ў сярэдзіне дня 7 сакавіка станцыі былі адключаны ад сеткі».

# І Ў МІРНЫ ЧАС У СТРАІ

**Звычайна пра гэтых людзей часцей за ўсё згадваюць напярэдадні чарговай гадавіны вываду войск з Афганістана. І калі шчыра з імі пагаварыць, можна зразумець, што яны хацелі б больш увагі, ды і павагі да сябе, не толькі ў сярэдзіне лютага...**

Але гэтыя мужныя людзі не прывыклі нешта патрабаваць. Сапраўдныя мужчыны, яны заўсёды гатовыя дапамагчы ў цяжкую хвіліну не толькі адзін аднаму, але і тым, хто слабы. Воіны-інтэрнацыяналісты востра адчуваюць чужы боль. Безумоўна, на гэта паўплывалі жахі вайны.

З Валерыем Ананчанкам і Валянцінам Васільевым мы пазнаёміліся ў аддзяленні знаходжання для людзей з інваліднасцю тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Кастрычніцкага раёна г. Віцебска. Загадчыца гэтай установы Алеся Сярогіна запрасіла воінаў-інтэрнацыяналістаў сустрэцца з дзецьмі з абмежаванымі магчымасцямі.

Хлопчыкам і дзяўчынкам госці расказалі пра службу. Наведвальнікі аддзялення паказалі творчыя нумары. У прыватнасці, спелі шлягер савецкага часу: «У салдата выхадны...»

Шчырасць мужчын не пакінула нікога з слухачоў раўнадушнымі. Адна справа — убачыць кіно пра вайну ў Афганістане, але, безумоўна, мастацкі фільм ніколі не будзе поўнасцю адпавядаць рэчаіснасці. Таму жывая гутарка з ветэранамі — вельмі каштоўны вопыт.



## ЖАХІ ВАЙНЫ І РАДАСЦЬ ВЯРТАННЯ

Валерый Генадзевіч Ананчанка, якому ўжо 71 (не верыцца, бо выглядае вельмі молада), родам з пасёлка Крулеўшчына Докшыцкага раёна. Ён — старшыня Віцебскай гарадской арганізацыі «Братэрства» грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане». Яднае вакол сябе такіх жа аднадумцаў, хто хоча займацца патрыятычным выхаваннем дзяцей моладзі. Каардынуе аказанне дапамогі ўдовам і маці загінулых, арганізацыю паходаў і аўтамабільных прабегаў, іншыя акцыі.

У Афганістане служыў у 1985—1987 гадах. А да гэтага — у Чэхаславакіі, ГДР. Старшы прапаршчык займаўся рамонтам танкаў і іншай ваеннай тэхнікі, камандаваў суправаджэннем калон. За два гады — 63 калоны!

У першы раз пад абстрэл трапіў, калі служыў усяго другі тыдзень. За час службы перахварэў на халеру, быў кантужаны. Ён расказаў пра жахі вайны... І ніколі не забудзецца радасць вяртання дамоў.

Наконт добрага выгляду суразмоўнік сказаў, што працуе дворнікам. Калі чысціць снег, вельмі добрая зарадка атрымліваецца. А ўстае ён а чацвёртай гадзіне раніцы штодня! Пажартаваў, але толькі наконт прафесіі. Ён ваенны пенсіянер, а наводзіць чысціню ў двары свайго прыватнага дома.

## ПОДЗВІГ КАПІТАНА

Валянцін Мікалаевіч Васільеў нарадзіўся ў Віцебску. Вучыўся тут у школе, ПТВ, дзе навучыўся вадзіць аўтамабілі і рамантаваць іх. Служыў у Афгане тэрміновую. Спачатку скончыў вучэбную частку ў Туркменістане. У Афганістане быў спярша ў танкавым батальёне, потым залічылі ў склад асобнага аднаўленчага батальёна механікам-кіроўцам. Таксама эвакуіраваў і рамантаваў падбітую тэхніку.

Ваяваў з верасня 1982-га да студзеня 1985-га. Тлумачыць гэта тым, што фактычна «пераслужыў» з-за таго, што не было замены. Камбат папрасіў яго, малодшага сяржанта, «падстрахаваць маладых ды яшчэ «зялёных» — тых, хто нядаўна ў арміі. Як тут адмовіш? Ды і насамрэч трэба было падвучыць ваяваць навабранцаў. Верагодна, гэтым самым ён выратаваў шмат жыццяў.

На вайне, кажуць, усякае бывае. Аднойчы падчас баявой аперацыі заблукалі і трапілі ў... Іран. Граніц звычайных — з дротам, раздзялыльнымі палосамі — там няма...

Пасля вайны мужчына стаў супрацоўнікам асобнага батальёна ДАІ. 25 студзеня 2005 года капітан міліцыі Васільеў на «Шкодзе-Актавіі» ў Віцебскім раёне суправаджаў калону з чатырох аўтобусаў, у якіх былі дзеці з тэрыторый, што пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Везлі іх паправіць здароўе на Гарадоччыну.

Насустрач калоне ехаў «Фольксваген-Пасат». Ад дрэнных умоў надвор'я і не вельмі добрага стану дарогі аўто, як кажуць аўтамабілісты, стала круціць. Міліцыянер падставіў службовае аўто пад машыну, якая неслася насустрач. І трапіў у кювет — але ні драпіны. Праўда, жартуе, яшчэ б крыху і наляцеў бы на дрэва... За рулём

> **«Адна справа — убачыць кіно пра вайну ў Афганістане, але, безумоўна, мастацкі фільм ніколі не будзе поўнасцю адпавядаць рэчаіснасці. Таму жывая гутарка з ветэранамі — вельмі каштоўны вопыт».**

легкавіка была жанчына. Яна вельмі спужалася, але таксама не паранілася...

За подзвіг афіцэра ўзнагародзіў медалём «За адзнаку ў ахове грамадскага парадку» асабіста Прэзідэнт. Ветэран баявых дзеянняў падзяліўся ўражаннямі. У прыватнасці, быў здзіўлены моцным поціскам рукі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота аўтара.**

Профі

# ДАСЛЕДЧЫКІ АСАБЛІВАГА НАДВОР'Я

**Метэаралагічныя зводкі даўно сталі неад'емнай часткай нашага жыцця. Але калі звычайнага чалавека, як правіла, цікавіць, як жа давядзецца апранацца і ці браць з сабой парасон, то ў Ваенна-паветраных сілах і войсках проціпаветранай абароны прагноз надвор'я адрозніваецца максімальнай скрупулёзнасцю. Стаўка пры гэтым вельмі вялікая — бяспека палётаў і экіпажа кожнага лятальнага сродку.**



Займаюцца ж аналізам абстаноўкі «за бортам» спецыяльна навучаныя афіцэры — ваенныя метэаролагі. Іх у нашай краіне не так шмат — усяго некалькі дзясяткаў. У Беларусі гэтай справе не вучаць. Нашых ваенных метэаролагаў рыхтуюць у Варонежы, на базе Ваенна-паветранай акадэміі імя прафесара Жукоўскага і Гагарына па мэтавым наборы, які праводзіць Міністэрства абароны. Адзін з іх — **начальнік метэаралагічнай службы 50-й змяшанай авіябазы, капітан Якаў МІНЬКО**. Ён і расказаў пра асаблівасці сваёй работы.

— Неспрактыкаванаму чалавеку здасца, што мы выконваем такія ж задачы, як і грамадзянскія метэаролагі. Але гэта зусім не так. Задачы ў нас выключна спецыялізаваныя. Напрыклад, вы ў звычайным прагнозе надвор'я не прачытаеце пра тэмпературу паветра на вышыні ў некалькі тысяч метраў або пра тое, у які бок і з якой сілай там дзьме вецер. Ды і навошта звычайнаму чалавеку пра гэта ведаць? А вось лётчыкі пра метэасітуацыю ў сваім паветраным эшалоне павінны быць абазнаныя на сто працэнтаў, — заўважае Якаў Мінько. — Тым больш што надвор'е пераменлівае ў нас нават у прыземным слоі паветра. Што ўжо казаць пра вышыню, дзе сітуацыя на адлегласці ў тысячу і дзве тысячы метраў ад паверхні зямлі можа кардынальна адрознівацца? А наша задача — пралічыць усе такія з'явы максімальна аператыўна і дакладна. Таму работа ваеннага метэаролага ўвесь час звязана з аналізам і маніторынгам даных.

Які ж час года найбольш складаны для ваенных метэаролагаў? Што для адных прыгожа, для другіх — істотнае абцяжарванне ўмоў работы...

— Больш за ўсё клопату нам дадаюць восень і зіма, — кажа Якаў Мінько. — Папершае, гэта вялікая колькасць ападкаў і іх разнастайнасць: снег, мокры снег, дождж, імжа... А па-другое, мы абавязкова робім разлікі ніжняй мяжы воблачнасці і бачнасці. Уплывае і тое, што светлавы дзень становіцца вельмі малы. Але складанасці датычацца не толькі прагназавання метэасітуацыі для палётаў. Напрыклад, калі пройдзе снег, то трэба прыбіраць узлётна-пасадачную паласу, падтрымліваць аэрадром у стане пастаяннай гатоўнасці. І гэта ўжо не кажучы пра магчымасць абледзянення, калі тэмпература ў прыземным слаі паветра адмоўная, а наверсе — станоўчая.

Дзве апошнія зімы былі не падобныя адна да другой. Калі ў 2019-м зіма засталася хіба толькі ў календары, то на рубяжы 2020—2021 гадоў нас чакаў увесь спектр адпаведных умоў надвор'я: моцныя маразы, істотныя снегапады, галалёд, парывісты вецер, адлігі...

— Не сказаць, каб гэтая зіма была асабліва цяжкая. Лічу, што яна прайшла як па падручніку. Хоць, вядома ж, для нашай работы гэта больш складана.

***— 50-я змешаная авіябаза знаходзіцца непадалёк ад Мінска. Наколькі ж вялікая розніца ў надвор'і паміж мегаполісам і невялікім пасёлкам каля яго?***

— Як правіла, тэмпература ў сталіцы заўжды вышэйшая. Часцей за ўсё — на градус-два. Усё-ткі там шмат крыніц цяпла: аўтамабілі, прадпрыемствы, жылыя дамы. Яны скажаюць рэальную абстаноўку. А за горадам усё гэта нівелюецца. І зноў жа, у выпадку палётаў над Мінскам наша задача — пралічыць усё гэта, што датычыцца і ападкаў. Не так даўно, напрыклад, была дзіўная сітуацыя: на захадзе

> **«Задачы ў нас выключна спецыялізаваныя. Напрыклад, вы ў звычайным прагнозе надвор'я не прачытаеце пра тэмпературу паветра на вышыні ў некалькі тысяч метраў або пра тое, у які бок і з якой сілай там дзьме вецер».**

сталіцы ішоў моцны снегапад, а ў гэты ж час на яе ўсходзе свяціла сонейка.

***— Ці супрацоўнічаеце з Белгідраметам?***

— Хутчэй можна сказаць, што мы звяраем некаторыя нашы даныя. Справа вось у чым. Сетка метэастанцый Белгідрамета даволі вялікая, ну а мы працуем перш за ўсё па ваенных аэрадромах. Але нярэдка складваецца такая сітуацыя, калі мы спрагназавалі, што ў дадзены момант часу палёт выконваць нельга, а, скажам, праз дзве гадзіны надвор'е стане ўжо спрыяльнае. Але нам трэба ўдакладніць усё датычна бачнасці і ніжняй мяжы воблачнасці. І, як правіла, нашы разлікі супадаюць. Але па прагнозах грамадзянскіх метэаролагаў ваенная авіяцыя лятаць не можа. Больш за тое, ад умоў надвор'я залежыць чарговасць палётаў.

> **«Больш за ўсё клопату нам дадаюць восень і зіма. Па-першае, гэта вялікая колькасць ападкаў і іх разнастайнасць: снег, мокры снег, дождж, імжа... А па-другое, мы абавязкова робім разлікі ніжняй мяжы воблачнасці і бачнасці».**

***— А як часта выконваецца паветраная разведка надвор'я?***

— Без яе не могуць пачынацца планавыя палёты. Адбываецца яна проста: найбольш падрыхтаваны экіпаж узлятае ў паветра. У гэты час мы з асабовым саставам праводзім заняткі па выяўленні небяспечных з'яў надвор'я. Экіпаж, які выконвае палёт, дакладвае шмат важных параметраў: бачнасць, ападкі; замярае кірунак і хуткасць ветру на розных вышынях, вымярае тэмпературу, верхнюю і ніжнюю межы воблачнасці...

І, канешне ж, назіранні вядуцца і з зямлі. Дапамагаюць у гэтым новыя лічбавыя метэаралагічныя комплексы, удзел чалавека ў рабоце якіх мінімізаваны. Ёсць у ваенных метэаролагаў і свой радар.

— Яго па праве можна назваць вачыма сіноптыка, асабліва ў летні перыяд. Ён багаты на неспрыяльныя з'явы надвор'я — лівні, шквалы, град, навальніцы, — адзначае Якаў Мінько. — Экіпажам забаронена ўваходзіць у магутную кучавую воблачнасць, дзе і развіваюцца гэтыя працэсы. Але каб правільна разлічыць час палёту да надыходу, скажам, атмасфернага фронту, радар проста незаменны...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота аўтара.**

Аты-баты

## ДЭСАНТНІКІ НА ВУЧЭННЯХ

**Да 5 красавіка пад кіраўніцтвам камандуючага сіламі спецыяльных аперацый генерал-маёра Вадзіма ДЗЕНІСЕНКІ праходзіць тактычнае вучэнне з 38-й Брэсцкай асобнай гвардзейскай дэсантна-штурмавой брыгадай. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе Міністэрства абароны.**

— Брыгада ўжо даўкамплектавана вайскоўцамі запасу. Вопыт атрымаюць не толькі салдаты і сяржанты, але і прапаршчыкі і афіцэры, — адзначылі ў ваенным ведамстве.

У праграме вучэння дэсантнікаў — марш, пераадоленне воднай перашкоды, адпрацуюць дэсантаванне з ІЛ-76МД, а таксама баявую стральбу ў складзе падраздзялення.

Супрацоўніцтва

## ТАПОГРАФЫ СУСТРАКАЮЦЦА Ў МАСКВЕ

**У канцы сакавіка ў Маскве сустрэнуцца прадстаўнікі Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь. Яны абмяркуюць выпрацоўку адзіных падыходаў у кірунку ўніфікацыі тэхналогій і нарматыўна-тэхнічных дакументаў, якія рэгламентуюць выраб сродкаў тапагеадэзічнай інфармацыі, паведамляе прэс-служба ваеннага ведамства.**

На чале дэлегацыі з Беларусі — **кіраўнік навігацыйна-тапаграфічнай службы Узброеных Сіл — начальнік навігацыйна-тапаграфічнага ўпраўлення Генеральнага штаба Узброеных Сіл палкоўнік Аляксей БАКАНАЎ**.

— Будуць разгледжаны пытанні, якія датычацца выпрацоўкі адзіных падыходаў да тэхналогій вырабу лічбавых сродкаў тапагеадэзічнай інфармацыі. На іх аснове выкарыстоўваюцца праграмныя, інфармацыйныя і тэхнічныя сродкі, а таксама ўзгадняюцца адзіныя нарматыўна-тэхнічныя дакументы, што рэгламентуюць пытанні стварэння сучасных сродкаў тапагеадэзічнай інфармацыі, — адзначылі ў прэс-службе Міністэрства абароны.

Акрамя таго, службовыя асобы абмяркуюць асаблівасці падрыхтоўкі і правядзення конкурсу «Мерыдыян». Ён пройдзе на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі падчас Армейскіх міжнародных гульняў — 2021. Вайскоўцы навігацыйна-тапаграфічнай службы Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь возьмуць у ім удзел.

Беларусь памятае

# Марыя Акцябрская і яе «Баявая сяброўка»

**Яркія старонкі ў біяграфію краіны ўпісалі многія нашы суайчынніцы, якія сталі прыкладам патрыятызму, працавітасці і вернасці грамадзянскаму абавязку і сям'і. Неацэнны ўклад у Вялікую Перамогу над гітлераўскімі захопнікамі ўнеслі жанчыны, многія з якіх мужна прайшлі агністымі франтавымі дарогамі, вавялі ваеннымі медыкамі, сувязістамі, лётчыкамі, снайперамі, разведчыкамі, партызанамі. У адным шэрагу з гэтымі адважнымі жанчынамі — механік-кіроўца танка «Баявая сяброўка» гвардыі сяржант Марыя Васілеўна Акцябрская, якая вызначылася пры вызваленні Беларусі ад нямецка-фашысцкіх акупантаў.**



Яна нарадзілася 3 жніўня 1902 года ў Крыме ў вялікай сям'і ўкраінскіх сялян. Дзяцінства правяла ў Севастопалі і Джанкоі, школу скончыла ў Сімферопалі. Працавала на кансервавым заводзе, тэлефаністкай на гарадской тэлефоннай станцыі. У Сімферопалі Марыя Васілеўна пазнаёмілася з кавалерыстам Ільёй Фёдаравічам Радэнкам. У 1925 годзе маладыя людзі пажаніліся. Яны вырашылі, што іх новая сям'я павінна атрымаць і новае прозвішча — Акцябрскія. Марыя вельмі адказна паставілася да ролі жонкі камандзіра:




«Выйшла замуж за воіна — і ты служыш у войску; жонка камандзіра — гордае званне і тое, якое абавязвае». Жанчына навучылася кіраваць аўтамабілем, страляць з вінтоўкі, нагана, кулямёта, кідаць гранаты, скончыла курсы медсясцёр, здала нормы на званне «Варашылаўскі стралок». Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, Марыя з мужам жылі ў Кішынёве. Ілья Акцябрскі пайшоў на фронт, Марыя Васілеўна эвакуіравалася ў Томск, дзе зноў пачала працаваць тэлефаністкай. У канцы лета 1941 года яна атрымала «пахавальны ліст», у якім гаварылася: «Ваш муж, палкавы камісар Ілья Фядотавіч Акцябрскі, загінуў смерцю храбрых 9 жніўня 1941 г. у адным з баёў на Украіне». Пазней Марыя даведалася, што яе муж у сваім апошнім баі пад Кіевам асабіста вёў байцоў у контратаку, пакуль не быў забіты кулямётнай чаргой.

Вялікае асабістае гора не зламала моцную духам жанчыну. Яна вырашыла пайсці на фронт. Марыя неаднаразова звярталася ў ваенкамат з просьбай накіраваць яе ў дзеючую армію, але атрымлівала адмову — ёй было 36 гадоў, і яна перанесла цяжкае захворванне. У гэты перыяд у краіне ішоў актыўны збор сродкаў на абарону краіны — на пабудову самалётаў, танкаў, бронемашын. Марыя таксама пачынае збіраць грошы і вырашае на свае зберажэнні пабудаваць танк. Да вясны 1943 года патрэбная сума — 50 тысяч рублёў — была сабрана і адпраўлена ў Дзяржбанк.





Сабраўшы грошы, Марыя ідзе на адчайны крок: яна адпраўляе тэлеграму на імя Сталіна. Вось што было ў ёй сказана: «У баях за Радзіму загінуў мой муж — палкавы камісар Акцябрскі Ілья Фядотавіч. За яго смерць, за смерць усіх савецкіх людзей, закатаваных фашысцкімі варварамі, хачу адпомсціць фашысцкім сабакам, для чаго ўнесла ў Дзяржбанк на пабудову танка ўсе свае асабістыя зберажэнні — 50 000 рублёў. Танк прашу назваць «Баявая сяброўка» і накіраваць мяне на фронт у якасці кіроўцы гэтага танка». І вельмі хутка прыйшоў адказ з падзякай за клопат аб бранятанкавых сілах Чырвонай Арміі і пра тое, што яе жаданне будзе выканана.

У маі 1943 года Марыя Акцябрская папоўніла строй курсантаў навучальнага танкавага палка ў Омску, у якім рыхтавалі спецыялістаў-танкістаў. Курс механіка-кіроўцы ў гэтым палку займаў чатыры месяцы. Пасля паспяховай здачы экзаменаў Марыі прысвоілі званне «сяржант» і залічылі ў экіпаж малодшага лейтэнанта Пятра Чабоцькі, у які таксама ўвайшлі сяржант Генадзь Ясько і стралок-радыст Міхаіл Галкін. На вежы новай «трыццацьчацвёркі» з двух бакоў вывелі белай фарбай — «Баявая сяброўка». Экіпаж быў уключаны ў склад 2-га батальёна 26-й гвардзейскай танкавай брыгады 2-га гвардзейскага танкавага корпуса.




Танк Т-34 «Баявая сяброўка» з ходу ўступіў у бой у канцы 1943 года каля вёскі Новае Сяло на Віцебшчыне. Падчас жорсткай бітвы танк быў падбіты. Марыю паранілі ў нагу, але экіпаж не пакінуў машыну. Двое сутак танкісты вялі агонь з гармат і кулямёта, а ўначы рамантавалі танк. Аб экіпажы і яго адважным механіку-кіроўцу напісала франтавая газета: «Слаўная «трыццацьчацвёрка» «Баявая сяброўка» працягвае наводзіць жах на гітлераўскіх захопнікаў. Толькі ў адным баі танкісты знішчылі дзве аўтамашыны, больш за 30 салдат і афіцэраў праціўніка. Калі скончыліся боепрыпасы, механік-кіроўца тав. Акцябрская рашуча і смела пратараніла нямецкую калону».

Камандзір 26-й гвардзейскай танкавай брыгады палкоўнік Сцяпан Несцераў падпісаў узнагародны ліст, у якім гаварылася: «Гвардыі сяржант Акцябрская на набытым ёю за наяўны разлік танку адпомсціла фашыстам за смерць свайго мужа. Акцябрская — смелы, бясстрашны воін». Ордэн Айчыннай вайны І ступені быў уручаны ёй у шпіталі Смаленска.

17 студзеня 1944 года пад Віцебскам, дзе ішлі цяжкія баі, у адной з бітваў каля чыгуначнай станцыі Крынкі Лёзненскага раёна, механік-кіроўца Марыя Акцябрская раздавіла сваёй баявой машынай два кулямётныя пункты і два дзясяткі варожых салдат і афіцэраў. У гэтым баі танк быў падбіты. Нерухомы, ён быў добрай мішэнню. Пад агнём Марыя вылезла з машыны, каб ліквідаваць пашкоджанне, але асколкамі была цяжка паранена ў галаву. На самалёце Марыю Васілеўну даставілі ў Смаленск. Урачы шпіталя, куды была дастаўлена жанчына, рабілі ўсё, што маглі, каб выратаваць яе, але раненне аказалася занадта цяжкім...

15 сакавіка 1944 года гвардыі сяржант Марыя Акцябрская памерла ў Смаленскім франтавым шпіталі. Пахавана ў Смаленску. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 2 жніўня 1944 года за мужнасць і гераізм, праяўленыя ў баях, гвардыі сяржанту Акцябрскай Марыі Васілеўне прысвоена званне Героя Савецкага Саюза (пасмяротна). Імянны танк працягваў змагацца з немцамі да самага Кёнігсберга.

Марыя Акцябрская залічана ў спісы адной з воінскіх часцей. У Смаленску, Джанкоі і Лёзне ямем названы вуліцы. На месцы апошняга бою, на чыгуначнай станцыі Крынкі на Лёзненшчыне, устаноўлены помнік.

**Мікалай ШАЎЧЭНКА.**

# «Хачу, каб людзі, якія стаяць у другой шарэнзе за мной, разумелі, што мы робім адну справу»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Тацццяна Аляксееўна, як прадпрыемствы лёгкай прамысловасці перажываюць пандэмію? Ці зменшыўся падчас яе попыт на адзенне і абутак? Ці дапамагло заставацца на плаву тое, што давялося часткова пераарыентавацца на пашыў масак і іншых сродкаў аховы?***

— Калі падводзіць вынікі мінулага года, то з сакавіка мы адчулі ўвядзенне каранцінных мер у суседніх краінах. А ў красавіку-маі экспарт прадукцыі скараціўся на 60 %, а ў некаторыя краіны і на 80 %. Гэта не магло не адбіцца на эканоміцы прадпрыемстваў, але ўсе яны захоўвалі працаздольнасць і рабочыя месцы. З красавіка ўсе калектывы масава пераключыліся на выраб новай для большасці з іх прадукцыі — бытавых масак і медыцынскіх касцюмаў, халатаў, фартухоў, бахіл. Хоць прадукцыя нескладаная па вырабе, але гэта новы прадукт, які мусіць адпавядаць ДАСТам і патрабаванням. У красавіку-маі сутыкнуліся з недахопам марлі. Яе звыклых аб'ёмаў не хапала, таму ўчасткі на Баранавіцкім вытворчым баваўняным аб'яднанні і на магілёўскай «Стужцы» былі пераведзены на кругласутачны рэжым работы. На «Магатэксе» і на Аршанскім ільнокамбінаце частка ткацкіх станкоў была пераналаджана на вытворчасць марлі, хоць гэта працэс няхуткі: для перанастройкі і запраўкі сыравінай патрэбна да тыдня. Было распрацавана новае баваўняна-эфірнае палатно, якое адпавядала патрабаванням для бытавых масак. Усе вытворчыя магутнасці ў краіне, дзе ёсць машыны, якія могуць вязаць гумку, бейкі для выкарыстання ў гэтым асартыменце, таксама былі перанастроены і максімальна загружаны.

Дзесьці з 20 лютага гэта работа пачалася, а пік нагрузкі прыпаў на красавік-май. Я памятаю, у нас не было ніводнага выхаднога і свята: 8 Сакавіка (а гэта была нядзеля) мы выводзілі людзей на работу. Падключылі ўвесь бізнес лёгкай прамысловасці і індывідуальных прадпрымальнікаў, нават некаторыя абутковыя і галантарэйныя прадпрыемствы, каледжы. Выпускалі 2,2 мільёна масак у суткі. У чэрвені прыватная магілёўская фірма набыла аўтамат па вытворчасці аднаразовых медыцынскіх масак (ён здольны вырабляць 1,5 мільёна штук у суткі) і, вядома, стала лягчэй. Хоць і сёння часткова вытворчасць медыцынскіх касцюмаў і бахіл на нашых прадпрыемствах працягваецца.

Другі квартал мінулага года, калі многія рынкі закрыліся, прайшоў для нас з паказальна нізкай эфектыўнасцю. Наш асноўны маржынальны рынак — Расія, і яна прыняла рашэнне аб лакдаўне, у красавіку-маі ўсе магазіны і гандлёвыя пункты былі зачынены. Тут яшчэ і псіхалагічны момант, калі людзі вымушаны сядзець дома, таксама адбіўся на аб'ёмах рэалізацыі. Здавалася б, адзенне, абутак і галантарэя — прадукцыя запатрабаваная, але ў крызісныя часы прыярытэтнасць мяняецца, на першы план выходзяць медыцына і здароўе.

***— У такіх умовах пакупнік найчасцей аддае перавагу інтэрнэт-магазінам...***

— І мы развівалі інтэрнэт-гандаль. Сёння ўсе нашы прадпрыемствы ўсведамляюць, што прасоўванне тавараў мусіць быць і праз інтэрнэт-магазіны, і не толькі. Зручная форма, якая спадабалася многім пакупнікам, — тэлемагазіны. Дома можна паглядзець тавар, паслухаць пра яго ўласцівасці, замовіць па тэлефоне, і табе яго даставяць, дадуць магчымасць памерыць. Шэраг нашых прадпрыемстваў, у прыватнасці Аршанскі льнокамбінат, Лідская абутковая фабрыка, «Купалінка», «Світанак», ужо вядуць работу з тэлемагазінам «Дома ТБ». Зразумела, такія пляцоўкі патрабуюць як мага ніжэйшую цану, і нашым вытворцам не проста задаволіць іх пажаданні. Часам даводзіцца кіраваць працэсам і ў ручным рэжыме: тэлефануеш кіраўнікам нашых прадпрыемстваў: «У цане вы не сышліся, але давайце падумаем, як мы можам з імі працаваць». Усё ж такі гэта напрацаваная база спажыўцоў, канал заваяваў іх лаяльнасць. Пакуль, вядома, беларускай прадукцыі ў тэлемагазінах мала, і вельмі прыкра, што 70-75 % долі ў іх гадавой рэалізацыі — тавар Расіі. Але яе заснавальнікі гатовы з намі супрацоўнічаць і разумеюць важнасць вылучэння эфірнага часу для беларускага тавару. Спадзяюся, што ў найбліжэйшы час прадпрыемствы канцэрна будуць там прадстаўлены.

***— Якая цяпер сітуацыя з экспартам?***

— Сёлета мы бачым, што рынак Расіі ажыў. Нават праводзяць выстаўкі — нас запрашалі на Тыдзень расійскага тэкстылю і лёгкай прамысловасці, дзе ўдзельнікі, засумаваўшы па рабоце, абменьваліся планамі і перспектывамі. І мы намецілі шэраг наступных наведванняў. Але непакояць іншыя краіны. З Украінай, ЗША, еўрапейскімі нельга сказаць, што адбылося поўнае абнуленне, але работа далёкая ад дасканаласці. Калі людзі сядзяць дома, які гэта бізнес? Гасцінічная і рэстаранная сферы пакуль у ступары. А той жа тэкстыль — гэта не толькі хатнія прылады, але і вялікая частка рэстаранна-гасцінічнага бізнесу, дзе ў звычайны час пастаянна абнаўляюцца парцьеры, абрусы, сурвэткі, пакрывалы, дывановыя пакрыцці. Гэта вялікі пласт спажывання. Тэкстыльная група ў нас цяпер пакутуе, канешне. У таго ж Аршанскага льнокамбіната рынак Расіі ў структуры адгрузкі займае ўсяго 12-15 %, рынак Еўрасаюза — 33 %, Турцыі — каля 20 %, ЗША — каля 11 %. Таму сказаць, што ў нас усё добра, я не магу.

***— Адно з нараканняў на беларускае адзенне — яго высокая цана. І пакупнікі ідуць не ў магазіны айчынных вытворцаў, а на рынкі па кітайскі тавар, у «цюбецейкі» — па ўзбекскі, у сэканды... Беларускае адзенне так і застанецца ў высокім і сярэднім цэнавым сегменце?***

— Прынамсі ў найбліжэйшай будучыні я не бачу, што ў нас будзе магчымасць адпавядаць цэнам узбекскага вытворцы. Вялікую долю ў коштце нашых вырабаў мае сыравіна. У нашай краіне, акрамя лёну і скуры, сваіх сыравінных рэсурсаў няма. Мы вымушаны за валюту завозіць бавоўну, пэўныя сінтэтычныя складнікі. У «Светлагорскхімвалакна» і «Магілёўхімвалакна» сыравіна — нафтапрадукты, а гэта таксама імпарт з залежнасцю ад курса валюты і кошту барэля нафты. Увоз сыравіны — адзін з ключавых момантаў, які не дазваляе адпавядаць цэнам узбекскіх і кітайскіх вытворцаў. Акрамя таго, на сабекошт уплываюць і заработная плата нашых работніц, і кошт электраэнергіі, і сацыяльныя абавязацельствы...

Так, наша прадукцыя даражэйшая, але і па якасці яна іншая. Сёння шмат крытыкі ў наш адрас, магчыма, і дызайнеры нашы дзесьці недапрацоўваюць. Тым не менш якасць, пачынаючы ад тканіны, палатна, у нас адпавядае не толькі ўсім патрабаванням тэхнічнага рэгламенту, але і крытэрыям доўгайноскі, прання, эксплуатацыі, нагрузак і працяглага знаходжання ў адзенні. Усё пералічанае ў нас на належным узроўні. У больш таннага тавару да тэрміну эксплуатацыі і іншых якасных паказчыкаў падыходы крыху іншыя. Сёння не сакрэт, што частка ўзбекскага тавару, у прынцыпе, не адпавядае тэхнічнаму рэгламенту. І цяпер гэта для іх пытанне складанае — яны, магчыма, і хацелі б, але і тэхналагічны працэс з-за такіх момантаў падаўжаецца, і сабекошт павышаецца. Дзесьці трэба дадаць хімічных рэчываў для ўмацавання, фінішнай апрацоўкі, каб застабілізаваць колер, каб тканіна не давала ўсадкі пасля прання. А гэта затраты — пары, электраэнергіі, часу...

Так, мы знаходзімся ў сярэднім і высокім цэнавым сегменце, але і наш пакупнік прызвычаіўся, што беларускае — сінонім высокай якасці. Былі спробы ў некаторых нашых вытворцаў перайсці на больш танны прадукт: і па саставе, і па выкананні, і нават ігнараваць некаторыя патрабаванні па якасці. Але наш пакупнік патрабуе, каб шво не разыходзілася, нітка не раствaралася, піжама на 10 см не «падскоквала» пасля мыцця. І па саставе ў беларускай прадукцыі мусіць быць бавоўна, шэрсць ці як мінімум віскоза, а не поліэфір, які мы часам бачым ва ўзбекскіх майках, на якіх напісана «100 % бавоўна».

***— Як прыцягнуць да беларускіх вытворцаў моладзь, якая сёння аддае перавагу магазінам масмаркету, якіх у нас цяпер шмат?***

— Я мяркую, што нікога не варта актыўна зазываць. Не сакрэт, што для моладзі характэрна адмаўленне — калі навязваеш сваё меркаванне, яна зробіць наадварот. Відавочна, вельмі важны імідж, павага, лаяльнасць, і заваёўваць іх трэба работай і ў частцы дызайну, і даносіць вартасці беларускага прадукту праз СМІ, інтэрнэт-пляцоўкі, блогераў, інфлюенсераў. Гэтыя механізмы намі выкарыстоўваюцца, хоць яшчэ і не ў поўнай меры.

Важнае і разняволенне нашага вытворцы. Сёння на прадпрыемствах зашмат кансерватыўных меркаванняў. Часам, калі з'яўляецца нейкая смелая рэч, то чуеш: «Мы не зможам яе прадаваць — давайце не будзем запускаць». Сёння і тыя мастакі, якія ёсць на прадпрыемствах, гатовы даваць больш смелыя рашэнні, але, на жаль, у дырэктарскага корпуса, камерцыйнай службы свой погляд. Трэба больш давяраць мастакам і стылістам на прадпрыемствах, уводзіць такія пасады, як мэнэджар па развіцці, які нясе адказнасць за мадэлі, якія ідуць у вытворчасць, і за тое, што яны прадаюцца альбо не.



Zara, H&M і іншыя гандлёвыя сеткі, пра якія вы кажаце, размясцілі вытворчасць сваіх калекцый у Азіі і яшчэ ў 90-я затрацілі каласальныя рэсурсы на пракачку брэнда і фарміраванне лаяльнага кола пакупнікоў. Каля 20 % ад гадавой выручкі яны накіроўвалі на фарміраванне меркаванняў. Рэклама, імідж, адпаведныя манекеншчыцы — усё гэта яны зрабілі вельмі здорава. У нас распалася краіна, і мы выратоўвалі сваю вытворчасць, часта без ведаў асноў жорсткага рынку. А еўрапейцы мелі такі вопыт, спецыялістаў, тэхналогіі. Яны прыйшлі ў Кітай з яго танным працоўным рэсурсам, далі мільёнам людзей работу, а калекцыі фарміравалі еўрапейскія дызайнеры. Я была ў Кітаі і Бангладэш і бачыла, як выраблялася адзенне. Нярэдка яго адшываюць дзеці. Майка ў закупе каштуе 1,5-2 долары. Зрабіць так, каб наша была менш за 10 долараў, вельмі складана. Таму ў кожнага свая ніша.

Мяркую, што і моладзь прыходзіць да таго, што беларускае — гэта якасць. Фарміраваць лаяльнасць, дарэчы, дапамагае прыватны бізнес лёгкай прамысловасці. У нас каля дзвюх тысяч прадпрыемстваў, з іх палова займаецца менавіта шыццём і вязаннем вырабаў. Шмат дробнага бізнесу — невялікія кампаніі па 15 чалавек, асабліва ў Брэсцкай і Гродзенскай абласцях, ды і ў Мінскай. Яны сёння прадстаўлены ў сталічным гандлёвым цэнтры «Галерэя» ў Трэнд-парку. Там ёсць іміджавыя калекцыі сучаснага адзення для моладзі — у невялікіх серыях. Можна штосьці набыць без рызыкі сустрэць «двайніка» на вуліцы. Моладзь любіць гэтыя крэатыўныя і смелыя рэчы.

Дарэчы, з масавага і буйнога ў нас засталіся толькі бялізнавыя прадпрыемствы. Вялікая вытворчасць у «Камінтэрна», але гэта класічны мужчынскі касцюм, яшчэ ў «Контэ» і «Элемы». Два апошнія, дарэчы, запатрабаваны сёння і ў моладзі. Мяркую, што рана ці позна кожны прыходзіць да таго, што хочацца мець якаснае адзенне — натуральнае і прыемнае для цела.

***— Тацццяна Аляксееўна, на цяперашняй пасадзе вы працуеце паўтара года. Што самае складанае ў рабоце старшыні канцэрна?***

— Мне хацелася б, каб усе ў камандзе дырэктарскага корпуса прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці ідэйна, і па энергетыцы, і па натхненні выкладваліся на сто і больш працэнтаў на даверaных ім прадпрыемствах. У прыватным бізнесе заснавальнік ці наёмны дырэктар разумее, што ўсе яго рашэнні ўплываюць на прыбытковасць, і ад выніку яго работы будзе залежыць і зарплата, і жыццё гэтага прадпрыемства. Я дзяржаўны чалавек, і мне даверана дастаткова вялікая частка маёмаснага комплексу і дзяржаўных актываў. Таму мне вельмі важна, каб на кожным дзяржаўным прадпрыемстве (а іх сёння ў складзе канцэрна 43), прычым дастаткова буйных, кіраўнікі выкладваліся па поўнай для павышэння эфектыўнасці і выніковасці. Хачу, каб людзі, якія стаяць у другой шарэнзе за мной, разумелі, што мы адна каманда і робім адну агульную справу.

Галіна складаная і высокаканкурэнтная, прычым рашэнні патрэбны не заўсёды стандартныя — часам тое, што год таму прынесла поспех, не спрацуе сёння. Людзі павінны быць ініцыятыўныя, якія думаюць і хутка прымаюць рашэнні, кантралююць сітуацыю не толькі ў сябе. Некаторыя плачуць, што сёння пандэмія і нічога не прадаецца, але пастаянна трэба шукаць выйсце — любы пралаз. Самае складанае — знайсці такія рухавікі, якія працавалі б нягледзячы ні на што! З кожным годам канкурэнцыя па ўсіх напрамках узмацняецца, таму і ў дзяржсектары мэнэджар павінен быць крэатыўны, нераўнадушны, ініцыятыўны, неспакойны — толькі так можна выжыць і вывесці сваю каманду наперад у постпандэмійныя часы.

**Алена КРАВЕЦ.**

PARITETBANK

**ВНИМАНИЮ АКЦИОНЕРОВ**
**Открытого акционерного общества «Паритетбанк»**
***(место нахождения общества: г. Минск, ул. Киселёва, 61а)***

**Открытое акционерное общество «Паритетбанк» (далее – банк) сообщает, что очередным годовым Общим собранием акционеров банка 26 марта 2021 г., протокол № 1, принято решение:**

- объявить дивиденды по итогам работы банка за 2020 год по привилегированным акциям – в размере 0,000048 белорусского рубля на одну акцию; по простым (обыкновенным) акциям выплату дивидендов не производить;

- установить срок выплаты дивидендов по привилегированным акциям – начиная с 26 апреля 2021 г. с учетом требований законодательства и устава банка.

Список акционеров, имеющих право на получение дивидендов, составлен в соответствии с реестром акционеров банка по состоя-нию на 1 марта 2021 г.

Выплата дивидендов акционерам банка будет осуществляться:

юридическим лицам и индивидуальным предпринимателям – в безналичном порядке в соответствии с законодательством;

физическим лицам – в безналичном порядке в соответствии с законодательством либо в установленном порядке наличными денежными средствами.

Телефон для справок +37517 311 45 37.

**www.paritetbank.by**

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 27 октября 2014 года № 5. УНП 100233809.

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by** |
| **Продавец** | **ОАО «Молодечненский станкостроительный завод», ул. Замковая, 19, 222310, г. Молодечно** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by** |
| **Предмет электронных торгов** | |
| **Здание блока вспомогательных цехов** (здание специализированное для металлургического производства и металлообработки) общей площадью 2676,8 кв. м, инв. номер 630/С-79012, по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Замковая, 19М. **Составные части и принадлежности:** навес на металлических столбах, асфальтное покрытие | |
| **Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания здания блока вспомогательных цехов общей площадью 0,6144 га | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **66 917,21 белорусского рубля (снижение 80 %)** |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»** | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после электронных торгов |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | |
| Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by | |
| Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 3 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия | |
| Предыдущее извещение о проведении электронного аукциона в газете «Звязда» от 29.01.2021 г. | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: Начало торгов: 10.00 21.04.2021 г. Окончание торгов: 11.00 21.04.2021 г.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 19.04.2021 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by** |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**(Организатор аукциона)**
**извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Федерации профсоюзов Беларуси**

**Лот № 1, состав:** 1. Здание механической мойки, инв. № 500/С-61512, 664,3 кв. м. 2. Административное помещение, инв. № 500/D-691770, 2114,4 кв. м. 3. Участок ремонта и технического обслуживания автомобилей, инв. № 500/D-688148, 3987,2 кв. м. 4. Блок гаражей, инв. № 500/С-61513, 329,4 кв. м.

Адрес: г. Минск, ул. Бабушкина, 25/2, 25-4, 25/ 1-1, 25/3.

Обременения: аренда.

**Начальная цена с НДС** – 2 500 000,00 долларов США.

**Задаток** – 50 000,00 руб. Штраф – 50 000,00 руб.

Земельный участок неделимый, площадью 4,2350 га, с кадастровым номером 500000000004002695. Право общего долевого постоянного пользования (доля 31/50).

**Аукцион состоится 21.04.2021 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %.**

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Продавец: Унитарное предприятие «Белавтотурист», 220024, г. Минск, ул. Бабушкина, д. 25. Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 ОАО «Белагропромбанк», г. Минск ул. Романовская Слобода, 8, BIC банка BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами – 19.04.2021 в 11.00.

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

# Кожны салдат павінен быць на ўліку



## СВЕДКІ, АДГУКНІЦЕСЯ

Нават калі насельніцтва і не забываецца пра такія пахаванні, яны ўсё роўна застаюцца грамадзянскімі, бо нідзе не стаяць на ўліку і пра іх не ведаюць ні сельсавет, ні выканкам. Яшчэ горш, калі вёска наогул перастае існаваць. Людзі з'язджаюць, а могілкі застаюцца. І — знікаюць.

— Мы грунтоўна падышлі да вырашэння гэтай праблемы, — кажа **кіраўнік Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру», ваенны пісьменнік Мікалай БАРЫСЕНКА.** — Летась у снежні далі аб'яву ў мясцовыя сродкі інфармацыі, каб людзі адгукнуліся. І вось атрымалі ўжо дзясяткі два такіх паведамленняў. Напрыклад, адзін сведка напісаў, што ў вёсцы Баршчоўка Бабруйскага раёна на сельскіх могілках ёсць закінутае пахаванне з помнікам, на якім пазначана каля дзесяці прозвішчаў салдат. Будзем правяраць сігнал. З Чавускага раёна паведамілі пра магілу невядомага салдата каля вёскі Атражжа і на станцыі Благавічы. Маўляў, ніхто гэтыя пахаванні не даглядае. Трэба будзе таксама з'ездзіць, праверыць, на ўліку яны ці не.



Падчас вахтаў памяці пошукавікі вельмі цесна працуюць з насельніцтвам і часта даведваюцца пра новыя адзіночныя пахаванні.

— Калі мы працавалі ў Шклоўскім раёне, нам паведамілі, што на калгасным полі ёсць магілка санітаркі, нават з агароджай, але нідзе на ўліку не стаіць, — згадвае Мікалай Барысенка. — Яе трэба або пераносіць у брацкую магілу, або браць на ўлік. Мы, дарэчы, менавіта тады за гэтую тэму і зачапіліся, а цяпер кінулі кліч па ўсёй вобласці.

## ПАРА ЗАГЛЯНУЦЬ У НЯМЕЦКІЯ АРХІВЫ

Сёння для таго, каб пошукавікі пачалі дзейнічаць, дастаткова двух сведак, якія пацвердзяць, што гэта сапраўды пахаванне часоў вайны і там ляжыць чырвонаармеец або партызан. Сведкамі могуць быць як самі відавочцы або ўдзельнікі пахавання, так і іх дзеці або знаёмыя, якія ведаюць пра паходжанне магілы. Інфармацыю трэба перадаць у аддзел ідэалогіі выканкама, на тэрыторыі якога знаходзіцца пахаванне. Гэта неабходна для пастаноўкі магілы на ўлік як воінскага пахавання або пахавання ахвяр вайны.

Больш складана надаць статус закінутаму пахаванню, якое знешне нагадвае вайсковае. Для таго каб паставіць яго на дзяржаўны ўлік, патрэбны архіўныя дакументы, якія пацвердзяць, што яно сапраўды салдацкае.

— Паколькі мясцовасць была пад акупацыяй, знайсці архіўныя дакументы няпроста, — канстатуе Мікалай Барысенка. — Якія могуць быць дакументы, калі тут гаспадарылі немцы і паліцаі? Нямецкія архівы для нас адкрытыя, але не ведаючы мовы і вопісу фондаў, немагчыма нешта знайсці. Да таго ж трэба быць у тэме. Жыццё на акупаванай тэрыторыі — гэта наогул вельмі тонкія белыя плямы нашай гісторыі. Гэта табе не баявыя дзеянні, калі фронт стаіць і нямецкая дывізія злева, а савецкая — справа. Тут усё зразумела, хто вораг, хто наш. Баявыя зводкі, данясенні — гэта ўсё ёсць. А вось жыццё ў акупацыі — зусім іншая справа. Мы дагэтуль дакладна не ведаем, як Магілёў жыў у акупацыі, адны абрыўкі. Знаходзім пахаванні ў дварах, на пустэчы. І гэта горад, а не вёска. Добра, калі мясцовыя запісалі, якая баявая аперацыя была, што за чалавек пахаваны. Калі гэтага няма, устанавіць імя чырвонаармейца немагчыма.

## ТАК БЫЦЬ НЕ ПАВІННА

Усе салдацкія пахаванні павінны быць улічаны. Гэта народная памяць, гісторыя, боль. І ставіцца да справы павінны добрасумленна і самі людзі, і тыя, ад каго залежыць пастаноўка такіх магіл на ўлік.

**Прарэктар Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова, сенатар Алег ДЗЯЧЭНКА,** адразу ж называе некалькі няўлічаных пахаванняў на тэрыторыі сваёй акругі.

— На грамадзянскіх могілках вёскі Куты Вендаражскага сельсавета Магілёўскага раёна ёсць пахаванне Івана Фёдаравіча Свіршава, датаванае 1944 годам, — расказвае ён. — Гэта партызан Вялікай Айчыннай вайны. Загінуў 6 мая 1944 года. Да вайны працаваў інспектарам школ у абласным аддзеле народнай адукацыі. У спіс ваенных пахаванняў яго магіла не ўнесена, за ёй даглядаюць сваякі, якія жывуць у Магілёве.

Тут жа знаходзіцца пахаванне Уладлены Мікалаеўны Смірновай — роднай сястры падпольшчыцы і партызанскай сувязной Людмілы Мікалаеўны Смірновай. Уладлена Мікалаеўна памерла ад тыфу ў 1944 годзе. Яе магілу даглядаюць сваякі Маланні Іванаўны Мысавай-Лянькoвай, у якой яна жыла падчас вайны. Па сутнасці, чужыя людзі. Былое кіраўніцтва сельсавета неахвотна адрэагавала на маю прапанову паставіць гэтыя пахаванні на ўлік, спаслалася на цяжкасці з іх доглядам. Ведаю таксама ўлічаную, але не дагледжаную салдацкую магілу на тэрыторыі другога раёна. З такімі фактамі, лічу, трэба вельмі строга разбірацца. Забеспячэнне належнага догляду адзіночных воінскіх магіл — аснова нашай далейшай дзейнасці. Павінна быць сувязь пакаленняў.

А гэты выпадак ужо магілёўскі. Тры гады таму пошукавікам патэлефанавала жыхарка Магілёва Рэгіна Палазкова, якая расказала, што з 1944 года на яе агародзе пахаваны салдат. Раней, калі жывыя былі бацькі, яны даглядалі магілку, на ёй стаяў крыж. Потым месца абазначылі яблынькай. Пошукавікі выехалі на адрас, і факт пацвердзіўся. Рэгіна Палазкова прызналася, што калі спрабавала звяртацца ў дзяржорганы з такой прапановай, ёй сказалі, што трэба будзе плаціць за эксгумацыю. І жанчына некалькі гадоў маўчала, каб канчаткова вырашыцца. Плаціць нічога не прыйшлося. Ёй яшчэ і падзякавалі за інфармацыю.

## НЕ ТРЭБА МАЎЧАЦЬ

Толькі за мінулы год на тэрыторыі Магілёўскай вобласці было выяўлена і пастаўлена на ўлік 20 новых вайсковых пахаванняў. Сёлета ўлічана яшчэ адно — у Асіповіцкім раёне.

— Сельвыканкамы выяўляюць іх падчас інвентарызацыі могілак, але вельмі часта невядома, ці быў гэта ваеннаслужачы, — кажа **галоўны спецыяліст галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама Юлія ЗАЛОГА.** — Што датычыцца насельніцтва, то часцей за ўсё сігналізуюць жыхары вёсак, дзе ішлі жорсткія баі. Па іх зваротах складаюцца інфармацыйныя лісты, праводзіцца праверка, і, калі факт пацвярджаецца, звесткі накіроўваюцца ва ўпраўленне па ўвекавечанні, а аб'ект бярэцца на ўлік. Напрыклад, да нас звярнуўся пенсіянер, які на тэрыторыі ўрочышча Барок натрапіў на часовы саматужны знак байцу Чырвонай Арміі. Правялі праверку, і факт пацвердзіўся. Але бывае і наадварот. Брат з сястрой з Касцюковіцкага раёна амаль паўстагоддзя даглядалі магілку ў лясным масіве: ім нехта расказаў, што гэта воінскае пахаванне. У 2018 годзе яны вырашылі паведаміць пра яго ў выканкам. Былі праведзены адпаведныя пошукавыя работы, але астанкаў не знайшлі. Тым не менш мы заклікаем людзей, каб больш уважліва адносіліся да такіх вось абязлічаных ваенных магіл.

У Беларусі нядаўна была прынятая Праграма па ўвекавечанні памяці загінулых пры абароне Айчыны на 2021—2025 гады. У рамках яе рэалізуецца некалькі задач — дзяржаўны ўлік і ўтрыманне ў належным стане воінскіх пахаванняў і пахаванняў ахвяр войнаў. І няўлічаных магіл чырвонаармейцаў быць не павінна. І тут галоўнае — не маўчаць.

— Бясспрэчна, усе адзіночныя магілы неабходна ставіць на ўлік у выканкамы. І правяраць, — лічыць **начальнік упраўлення па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў Узброеных Сіл Сяргей ВАРАНОВІЧ.** — У выканкамах павінны вырашаць, як далей дзейнічаць: пакідаць іх на месцах або пахаваць у брацкую магілу. На дадзены момант у нас па краіне 149 няўлічаных пахаванняў. І сёлета мы іх будзем адпрацоўваць. Неабходна захоўваць кожную салдацкую магілу. І спадзяёмся на тое, што насельніцтва таксама адказна аднясецца да гэтай праблемы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара.**

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

БЕЛЭКСІМГАРАНТ
EXIMGARANT of BELARUS

# НА АБАРОНЕ ЭКСПАРТУ ПРЫДЗВІННЯ




**Карэспандэнты «Звязды» размаўляюць з дырэктарам Віцебскага філіяла Беларускага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства экспартна-імпартнага страхавання «Белэксімгарант» Наталляй ПАПЯЛЁНАК. Дарэчы, за 2020 год філіял «Белэксімгарант-Віцебск» умацаваў свае пазіцыі ў рэгіёне і заняў трэцяе месца сярод іншых страхавых кампаній.**



Дырэктар Наталля ПАПЯЛЁНАК.

***— Пракаментуйце, калі ласка, названую вамі лічбу: «Пералік страхавых прадуктаў для юрыдычных асоб вельмі вялікі і налічвае больш за 60 відаў».***

— Адразу важна памятаць, што «Белэксімгарант» з'яўляецца ўніверсальнай страхавой кампаніяй са 100-працэнтнай доляй дзяржавы. І мы яе пазіцыянуем менавіта як універсальную, нягледзячы на тое, што ў нас ёсць сваё прыярытэтнае поле дзейнасці. У чым універсальнасць? «Белэксімгарант» аказвае практычна ўвесь спектр страхавых паслуг, патрэбных у сваёй большасці карпаратыўнаму бізнесу. Гэта як так званая класіка страхавання — маёмасці, транспарту, грузаў, адказнасці перавозчыка і гэтак далей — так і асабістае страхаванне, у тым ліку медыцынскае (напрыклад, пакрыццё расходаў прадпрыемстваў і арганізацый на ахову здароўя членаў калектыву, страхаванне тых, хто выязджае за мяжу). Але асаблівацю Белэксімгаранта з'яўляецца тое, што мы можам страхаваць усе віды прадпрымальніцкіх рызык. Наш прыярытэтны напрамак — страхаванне экспартных рызык з падтрымкай дзяржавы. Калі юрыдычная асоба мае кантракты — знешнеэканамічныя ці ўнутраныя, якія заключаюцца на ўмовах адтэрміноўкі плацяжу, то можа звярнуцца да нас, і мы падбяром страхавы прадукт, які будзе мінімізаваць рызыку неаплаты і не толькі.

***— Што маецца на ўвазе пад абавязковым страхаваннем?***

— Страхаванне грамадзянскай адказнасці ўладальнікаў транспартных сродкаў. А яшчэ сертыфікат «Зялёная карта», поліс пагранічнага страхавання, абавязковае медыцынскае страхаванне для фізічных асоб, якія ўязджаюць на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь. Адказнасць перавозчыкаў перад пасажырамі і адказнасць пры перавозцы небяспечных грузаў. Паслугі гэтыя карыстаюцца вялікім попытам. На тэрыторыі вобласці даволі працяглая граніца з Расійскай Федэрацыяй, ёсць мяжа з Еўрапейскім саюзам, і на пагранпунктах і аўтапераходах працуюць нашы пункты продажу.

«Белэксімгарант» прапануе самыя разнастайныя віды страхавання для фізічных асоб. Гэта страхаванне маёмасці, транспарту, медыцынская страхоўка для тых, хто выязджае за мяжу.

Ва ўмовах пандэміі працаваць стала больш складана. Сур'ёзна зменшыліся, а потым і наогул звяліся да нуля аб'ёмы абавязковага страхавання на пагранпераходах, калі быў абмежаваны транспартны рух і пасажырапаток. Не працуе турыстычны бізнес, і нашы страты таксама адчувальныя.

## ЯШЧЭ РАЗ ПРА «САЛОМКУ» ДЛЯ ЭКСПАРЦЁРА

— Больш падрабязна хачу спыніцца на прыярытэтным кірунку — страхаванні экспарных і фінансавых рызык, — працягвае Наталля Аляксандраўна. — Бо наш карпаратыўны бізнес у ходзе гаспадарчай дзейнасці сутыкаецца з даволі шырокім спектрам небяспек. І гэтай праблематыкай мы, як структурнае падраздзяленне Белэксімгаранта, у сваім рэгіёне займаемся ўшчыльную. Пад выкананне гэтых задач скіравана структура нашага філіяла. У нас ёсць паўнавартасныя аддзелы абавязковага, добраахвотнага медыцынскага страхавання і самастойны аддзел па страхаванні экспартных і прадпрымальніцкіх рызык. Штогод распрацоўваем новыя страхавыя прадукты, бо ўсё цячэ, усё мяняецца, і патрэбна пасняваць — інакш не зможам называць сябе сучаснай страхавой кампаніяй.

***— Але экспартныя рызыкі складаюцца з палітычных і камерцыйных...***

— Міністэрства замежных спраў вядзе спецыяльную градуіроўку, дзе замежныя краіны падзяляюцца па ўзроўні палітычнай рызыкі. Тут усё зразумела. Тым больш што наш экспарт ідзе ў значнай ступені на тэрыторыю Расійскай Федэрацыі і ў краіны Еўрасаюза, якія таксама «навідавоку», у рэспублікі былога Савецкага Саюза.

Больш складана ацаніць камерцыйную рызыку пры пастаўках прадукцыі ці паслуг за мяжу. І размова ідзе пра комплексны андэррайтынг праекта. Гэта значыць, аналіз не толькі кантракта, усіх яго складнікаў, прыведзеных лічбаў і разлікаў, але і знаёмства, наколькі гэта магчыма, з тымі людзьмі, канкрэтнымі асобамі, якія стаяць за дакументам, з дзелавой рэпутацыяй заснавальнікаў і кіраўнікоў фірмы-контрагента.

Ажыццяўляецца аналіз з дапамогай замежных агенцтваў, якія з'яўляюцца нашымі дзелавымі партнёрамі як і ў Расійскай Федэрацыі, так і ў далёкім замежжы. Такая камунікацыя зводзіцца не толькі да атрымання пісьмовых крэдытных справаздач таго ці іншага кантрагента — за ёй часта стаяць і асабістыя кантакты супрацоўнікаў страхавых арганізацый, якія знаёмыя паміж сабой. Мне таксама тэлефануюць замежныя калегі і цікавяцца рэзідэнтамі свабоднай эканамічнай зоны «Віцебск»: як яны працуюць, ці можна ім давяраць. Бо за любым кантрактам, як правіла, стаяць вялікія грошы — дзяржаўныя ці карпаратыўныя, і даведацца пра дзелавую рэпутацыю атрымальніка тавараў ці паслуг, параіцца ніколі не лішне. Гэтак жа дзейнічаем і мы, што дае свой эфект.

## МАХЛЯРЫ ПРАЦУЮЦЬ ПРАФЕСІЙНА

***— Экспарцёр атрымлівае страхавое пакрыццё ад вас. А як вы вяртаеце свае сродкі?***

— Гэта таксама адзін са складнікаў нашай работы. На папярэдніх этапах юрысты кампаніі вывучаюць праект. Не будзе перабольшаннем сказаць, што мы лічым важным усебакова адшліфаваць знешнегандлёвы кантракт: нешта дабавіць, а нешта і памяняць, каб мінімізаваць рызыкі экспарцёра, а пры наступленні страхавога выпадку — нашы. І 90 працэнтаў страт, якія былі заяўлены ў філіял і выплачаны, вернуты ў Рэспубліку Беларусь. Па астатніх працягваем працаваць.

***— Ці было ў вашай практыцы такое, каб узгодненыя, у тым ліку і з вамі, экспартныя кантракты разрываліся? Што ў гэтым выпадку са страхаваннем страт?***

— Нам не даводзілася выплачваць страхавое пакрыццё ў падобных выпадках, а вось махлярскія схемы сустракаліся. Махляры ў гэтым выпадку робяць усё так, што западозрыць іх складана, яны прафесіяналы ў сваёй цёмнай справе. Параўнальна нядаўна мы сустрэліся з сітуацыяй, калі на экспарцёра, які даўно карыстаецца паслугамі Белэксімгаранта, выйшла быццам амерыканская кампанія і праз электронныя перапіскі пачала весці дыялог пра заключэнне дагавора на пастаўку прадукцыі на значную суму. Яны сабралі дастаткова ёмісты партфель дакументаў, дзе прычапіцца не было да чаго. Мы вывучалі і сайт кампаніі, і пункт разгрузкі — пастаўляцца павінна была падукцыя для будаўніцтва. Звярнулі ўвагу, што адсутнічае канчатковы адрас пастаўкі. Пачалі аналізаваць сацыяльныя сеткі — зыходзілі з таго, што ў буйных кампаній ёсць свае старонкі. Напісалі з ведама нашага экспарцёра праз «Фэйсбук» пісьмо ў гэтую кампанію і папрасілі пацвердзіць факт будаўніцтва і некаторую іншую базавую, скажам так, інфармацыю. За выхадныя дні, пакуль чакалі адказ, самі знайшлі ў электронным адрасе фірмы-атрымальніка лішні знак, лішнюю літару на лацініцы, што насцярожыла. А тут прыходзіць і адказ на наш зварот праз сацыяльныя сеткі, што ніякага кантракта яны з беларусамі не заключалі і не збіраліся. Мы ўсё гэта паведамілі нашаму экспарцёру



У дружным калектыве працуюць вядучы спецыяліст Святлана ЗАХАРАНКАВА, вядучы юрысконсульт Мікалай ПАЧЭПКА, начальнік аддзела Андрэй ШУДЗЕЛЬ, вядучы спецыяліст Кацярына КАЛІНІЧЭНКА, спецыяліст Альбіна АРНТ, начальнік аддзела Фелікс МАЛАЧКОЎ, вядучы спецыяліст Анастасія ЖОЛУДЗЕВА, вядучы спецыяліст Ірына БАШЧАНКА.




Вядучы спецыяліст Вікторыя ДАДЗЕРКІНА і намеснік начальніка аддзела Юрый ПАВЯДАЙЛА.

## ЯК ЖОНКА СПУСТОШЫЛА ФІРМУ

— Ёсць прадпрыемствы-рэзідэнты свабоднай эканамічнай зоны «Віцебск» з доляй замежнага капіталу, якія страхуюць абсалютна ўсё, нават рызыку ўзнікнення страт у сувязі з вымушаным прастоем вытворчасці. Дэманструюць такі вось падыход. Гэта тая самая «саломка», якую яны сабе падсцілаюць. Ажыццяўляецца поўная страхавая абарона ўсяго бізнесу, і гэта правільна. Асабіста мне вельмі трывожна, што даволі часта неапраўдана эканомяць на такой «саломцы» прадстаўнікі дзяржаўнага сектара эканомікі. Яны часцей за ўсё і нарываюцца на непрыемнасці. Асноўныя страхавыя выпадкі ў нас былі якраз на прадпрыемствах з доляй дзяржавы. Якія ў свой час на нашы прапановы застрахаваць экспартную здзелку адказвалі, што давяраюць атрымальнікам тавараў, бо гэта іх пастаянныя кліенты. Даўно трэба зразумець, што такая аргументацыя ва ўмовах рынкавай эканомікі не працуе.

Прывяду ўсяго адзін прыклад, калі адбылася звычайная, здавалася б, жыццёвая сітуацыя. Ва ўласніка расійскай кампаніі з суседняга Смаленска, у якога былі ўстойлівыя сувязі з нашым вытворцам і існаваў абсалютны ўзаемны давер, адбыўся шлюбаразводны працэс. Падчас судовага разбіральніцтва былі арыштаваны ўсе рахункі, базы і склады, замарожаны активы. У выніку бізнес пайшоў наперакос, а яшчэ патрэбна было плаціць падаткі, зарплату плюс арэнду і гэтак далей. З беларусамі ён разлічыцца не змог, і нам давялося кампенсаваць яго віцебскаму «сябру» страхавое пакрыццё. Калі б наш кліент не быў застрахаваны, увесь цяжар лёг бы на яго плечы.

Я ўжо адзначала, што нам атрымліваецца спаганяць фактычна ўсю валютную выручку. Хоць працэс гэта доўгатэрміновы, і прадухілілі велізарную пастаўку махлярам за акіян. Тэхнічны прагрэс дае шырокі спектр камунікацый, і варта імі карыстацца.

***— Ці здараецца страхаваць беларускія інвестыцыі за мяжой?***

— У нас ёсць менавіта такі прадукт — страхаванне айчынных інвестыцый за мяжой. Дарэчы, мы адпрацоўвалі нават праект інвесціравання будаўніцтва завода ва Угандзе. У рэшце рэшт нешта там не «зраслося», але мы атрымалі для сябе карысны вопыт. Так што запрашаем інвестараў звяртацца.

## КАЛІ КЛІЕНТЫ — БАНКІ

***— Наколькі ўсебакова развіваецца ваша супрацоўніцтва з банкамі, Наталля Аляксандраўна?***

— Банкі страхуюць у нас рызыкі невяртання крэдытаў, выдадзеных як на рэалізацыю інвестыцыйных праектаў, так і на бягучую дзейнасць. Калі ў прадпрыемства не хапае забеспячэння поўнасцю альбо часткова, тады ўважліва вывучаецца дзейнасць прадпрыемства, у тым ліку і намі. Бо мы рызыкуем, а падтрымаць вытворцу праз банк трэба. Так што наша суполка з банкамі — на карысць рэальнаму сектару, які імкнецца развівацца.

Страхуем банкаўскія гарантыі, калі банк дае сваё абавязацельства кліенту, які не можа забяспечыць цалкам або частку, і банк звяртаецца да нас. У выніку неабходнасці, калі палічым здзелку рызыкоўнай, з дапамогай цэнтральнага апарата выкарыстоўваем практыку перастрахавання.

***— А калі размова ідзе пра страхаванне банкаўскага крэдыту замежнаму пакупніку?***

— Займаемся і страхаваннем рызыкі невяртання крэдыту, выдадзенага пакупніку айчыннай прадукцыі, нерэзідэнту. Гэты наш прадукт рэалізуецца праз ААТ «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь», з якім мы ў такім кірунку шчыльна працуем. І прадукт карыстаецца дастаткова вялікім попытам.

Нашы правілы страхавання фінансавых рызык наогул даволі ёмістыя, уключаючы ў сябе практычна ўсе фінансавыя рызыкі, якія могуць узнікнуць у тым ліку і пры фінансаванні экспарту. Кароткатэрміновае фінансаванне — міжнародны факторынг — займае недзе трэць у сегменце экспартнага страхавання. І зараз, згодна са зменамі ва Указ № 534, з'явіцца такі прадукт, як крэдыт рэзідэнту, гэта значыць, вытворцу айчыннай прадукцыі, для далейшай яе рэалізацыі на экспарт. Фінансаванне экспарту ў рамках указа карыстаецца попытам як у дзяржаўнага сектара, так і ў прадпрыемстваў прыватнай формы ўласнасці. Фінансуюць банкі пад нашу страхоўку, прыярытэтнае права на якую зноў жа прапісана ва ўказе.

***— Дарэчы, у вас было першае на тэрыторыі вобласці страхаванне міжнароднага факторынгу...***

— Я вас крыху папраўлю: першае ў рэспубліцы. Здзелка такая была праведзена сумесна з Белінвестбанкам. Гэта наватарскі прадукт, і, пасля таго як мы яго рэалізавалі, ён даволі шырока ўвайшоў ва ўжытак Белэксімгаранта, заняў дастаткова вялікую нішу.

***— Ці прымаеце вы ўдзел у будаўніцтве завода белай бляхі на Віцебшчыне?***

— Завод — буйны VIP-кліент Белэксімгаранта, у яго ўзвядзенні прымае ўдзел перш за ўсё наша галаўная арганізацыя, прычым вельмі актыўна. Будоўля сапраўды маштабная, калі ведаць той аб'ём работ, які трэба будзе выканаць. Завод дасць штуршок для далейшага развіцця і горада Міёры, і ўсяго рэгіёна. Удзельнічаем і мы, страхуем будаўніча-мантажныя рызыкі.



Начальнік аддзела Сняжана АНУЧКІНА *(першая справа)*, вядучыя спецыялісты Ілья РАБКІН і Анжэла АЛАЛЕНКА.

асабліва калі ўлічваць розніцу ў заканадаўстве краін, часта вялікія тэрыторыі і адлегласці паміж імі. Як правіла, мы разумеем адзін аднаго з замежнымі контрагентамі, бо вядзецца прафесійная размова і ўсё заканчваецца мірным шляхам. У рэдкіх іншых выпадках мы ўмеем адстойваць свае інтарэсы і правы нашых кліентаў.

А ў прыватным сектары, які ахвотна страхуе свае знешнеэканамічныя рызыкі, страхавыя выпадкі здараюцца рэдка.

Хацелася б сустракаць большае паразуменне з боку кіраўнікоў буйных вытворчых калектываў не толькі пры страхаванні экспарту, але і тады, калі мы абмяркоўваем з імі і перспектывы медыцынскага страхавання ў калектыве. На мой погляд, яно павінна ўкараняцца паэтапна. Гэта дастаткова складаны від страхавання, бо маецца на ўвазе наша пастаянная камунікацыя як з застрахаванай асобай, так і з медыцынскімі ўстановамі. Медыцынскае страхаванне развіваецца ў нас нядрэнна, агульная колькасць застрахаваных па філіяле дасягнула пяці тысяч. Усе гэтыя людзі працуюць на прадпрыемствах — экспарцёрах Віцебскага рэгіёна, якія з'яўляюцца нашымі пастаяннымі кліентамі і карыстаюцца паслугамі Белэксімгаранта.




Кантролем заявак на медыцынскія паслугі застрахаваным асобам занятая спецыяліст Таццяна ГЕРТМАН.

## «У НАС КАЛЕКТЫЎ ПРАФЕСІЙНЫ»

— У нас цудоўны калектыў, дастаткова малады і актыўны, няма цякучкі кадраў і выпадковых людзей. Менавіта дзякуючы калектыўным стараннем аб'ём страхавога пакрыцця экспартных кантрактаў у нас расце. Усе спецыялісты з вышэйшай адукацыяй, шмат выпускнікоў эканамічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта. І ёсць выпускнікі знакамітага наргаса. У многіх выпадках людзі атрымалі спецыялізаваную адукацыю, менавіта па страхавой справе. Але працуюць не толькі фінансісты і эканамісты, але і людзі з інжынернай адукацыяй, якія займаюцца страхаваннем транспарту і ўрэгуляваннем страт у гэтай галіне, а таксама юрысты. Вядзецца перападрыхтоўка як у цэнтральным апараце, так і на пастаянна дзеючых курсах пры Мінфіне. Наведваем трэнінгі і семінары — пастаянна вучымся.

А кубкі і граматы на сцяне дырэктарскага кабінета, пра якія вы пытаецеся, — гэта ўзнагароды, заваяваныя на ўнутранай спартакіядзе Белэксімгаранта ці спартакіядах Мінфіна. Як правіла, займаем прызавыя месцы.

**Публікацыю падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ, Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ і Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).**

Беларускае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства экспартна-імпартнага страхавання «Белэксімгарант». УНП № 101421509.

Спецыяльны дазвол (ліцэнзія) № 2200/13-00049 на права ажыццяўлення страхавой дзейнасці. Выдадзены Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь 23 красавіка 2018 года.

**Ад рэдакцыі.** Шчыра дзякуем за ўсебаковую дапамогу ў падрыхтоўцы публікацыі супрацоўніцам службы па сувязях з грамадскасцю і рэкламе Белэксімгаранта Дар'і Ібрагімавай і Крысціне Шынкаровай.



Галоўны бухгалтар Жанна БАБРОВА і яе намеснік Святлана КАРОТЧАНКА.

# ОАО «Белювелирторг»

г. Минск, ул. Смоленская, 33. УНП 100129348

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС за 2020 год

(тыс. руб.)

| АКТИВ | Код строки | На 31.12.2020 | На 31.12.2019 |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| ИТОГО по разделу I | 190 | 21 605 | 21 669 |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| ИТОГО по разделу II | 290 | 89 877 | 78 415 |
| БАЛАНС (190 + 290) | 300 | 111 482 | 100 084 |
| ПАССИВ | Код строки | На 31.12.2020 | На 31.12.2019 |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| ИТОГО по разделу III | 490 | 38 134 | 33 753 |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| ИТОГО по разделу IV | 590 | 445 | 443 |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| ИТОГО по разделу V | 690 | 72 903 | 65 888 |
| БАЛАНС (490 + 590 + 690) | 700 | 111 482 | 100 084 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь – декабрь 2020 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2020 года | За январь – декабрь 2019 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 45 109 | 42 261 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (030 – 040 – 050) | 060 | 7 730 | 6 139 |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060+070-080) | 090 | 5 496 | 5 496 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100 – 110 + 120 – 130 ± 140) | 140 | (789) | (725) |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (±090 ±150) | 150 | 6 436 | 4 771 |
| ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200 – 250 – 260 – 270) | 210 | 5 214 | 3 850 |

**пункты 4–9**

### «Информация об открытом акционерном обществе и его деятельности»

Количество акционеров ОАО «Белювелирторг» – 2, в том числе юридических лиц – 1

| Наименование показателей | Ед. изм. | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров всего, в том числе юридических лиц | лиц | 2/1. | 2/1. |
| Комунальная собственность – доля в уставном фонде | % | 44,96 | 44,96 |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тыс. руб. | 278,08 | 832,76 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | 0,0637 | 0,1900 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | рублей | 8,7249 | 7,7210 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества, – всего | штук | | |
| Просроченная дебиторская задолженность | млн. руб. | | |
| Просроченная кредиторская задолженность | млн. руб. | | |

Среднесписочная численность работающих (человек) – 455.
Основной вид деятельности – розничная торговля ювелирными изделиями.

Директор А.С. Мишуто

Главный бухгалтер Н.В. Комар

### Итоговая часть аудиторского заключения

Отчетность ОАО «Белювелирторг» достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение аудируемого лица на 31.12.2020, а также финансовые результаты деятельности и изменения финансового положения аудируемого лица за 2020 год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь.

Общество с ограниченной ответственностью «Белросаудит»
Св. гос. рег. № 600506719 от 28.04.2000 г.

---

**БЕЛАРУСБАНК**

**Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк»**
сообщает о проведении 07 апреля 2021 года 95-го тиража выигрышей по выигрышным вкладам в белорусских рублях в центре банковских услуг № 529 ОАО «АСБ Беларусбанк» по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 56 (3-й этаж, конференц-зал).

**Начало тиража в 11.00.**

**Телефон для справок: 147 Контакт-центр.**

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 11.01.2019, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.*

---

УНП 300000398

**Открытое акционерное общество**

## «Дорожно-строительный трест № 1, г.Витебск»,

*(210026, г. Витебск, ул. Суворова, 16)*

**сообщает о том, что 25 марта 2021 года на годовом общем собрании акционеров открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 1, г.Витебск» ПРИНЯТО РЕШЕНИЕ О ВЫПЛАТЕ ДИВИДЕНДОВ за 2020 год**

Размер начисленных дивидендов за 2020 год на одну простую (обыкновенную) акцию составляет 0,018695132 рубля.

Срок выплаты дивидендов за 2020 год – до 30 апреля 2021 года.

Порядок выплаты дивидендов:

- физическим лицам:

а) выплата по отдельным ведомостям, одновременно с перечислением на карт-счета;

б) почтовым электронным денежным переводом;

- юридическому лицу: путем перечисления на расчетный счет.

---

**Республиканское государственное общественное объединение «Белорусское физкультурно-спортивное общество «ДИНАМО»**

## ОСУЩЕСТВЛЯЕТ ПОИСК ИНВЕСТОРОВ

для совместной реализации проектов по реконструкции зданий расположенных в г. Минске:

1. ул. Академическая, 11Б (здание общежития общей площадью 450,8 кв. м, площадь земельного участка 0,1142 га – право аренды (по 30.06.2046));
2. пер. Радиаторный 4-й, д. 34 (здание блокированного жилого дома общей площадью 139,0 кв. м, площадь земельного участка 0,1154 га – право постоянного пользования, имеется обременение);
3. пер. Путепроводный 6-й, д. 17 (здание блокированного жилого дома общей площадью 133,0 кв. м, площадь земельного участка 0,0950 га – право постоянного пользования);
4. пер. Путепроводный 6-й, д. 19 (здание блокированного жилого дома общей площадью 164,0 кв. м, площадь земельного участка 0,1040 га – право постоянного пользования, имеется обременение).
5. ул. Карла Либкнехта, 62Б, на земельном участке площадью 0,7535 га (право аренды по 31.03.2023) расположены:

- здание многофункциональное общей площадью 2654,3 кв. м;
- здание многофункциональное общей площадью 610,0 кв. м;
- здание проходной общей площадью 5,8 кв. м;
- здание проходной общей площадью 32,4 кв. м.

Заявки рассматриваются в течение тридцати дней с момента публикации объявления.

По вопросам приобретения и осмотра имущества обращаться по контактным телефонам: 8 029 675 77 50, 8 017 327 38 82 – начальник отдела управления собственностью Лосев Александр Николаевич, электронная почта для корреспонденции: bfso-dynamo@tut.by.

УНП 100073371

---

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **УП «Комбинат декоративно-прикладного искусства им. А.М. Кищенко»** (УНП 600126458) 222520, г. Борисов, ул. Блюхера, 19, тел. 8 033 688 86 54, в лице ликвидатора ООО «Правовая компания «Делегат».

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **13 апреля 2021 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**.

**Предмет торгов** – гараж, инв. № 1-005, общ. пл. 114 кв. м, механические мастерские, инв. № 01-008, общ. пл. 336,5 кв. м, производственный корпус керамического цеха, инв. № 01-010, общ. пл. 4027,0 кв. м, производственный корпус № 01-003, столовая комбината, инв. № 01-03а, общ. пл. 3000,1 кв. м, проходная, инв. № 01-006 (задняя), проходная центральная, инв. № 01-013, общ. пл. 13 кв. м, склад, инв. № 01-009, склад материальных ценностей, инв. № 01-017, общ. пл. 183,9 кв. м, склад материальных ценностей, инв. № 01-012, общ. пл. 103,7 кв. м, художественные мастерские, инв. № 01-002, общ. пл. 996 кв. м, г. Борисов, ул. Блюхера, 19, художественные мастерские 610/с-26438, инв. № 01-016, общ. пл. 200,6 кв. м, г. Борисов, пр-т Революции, 42А, художественные мастерские 610/с-26415, инв. № 01-004, гостиница, инв. № 01-001б – общ. пл. 459,8 кв. м, г. Борисов, пр-т Революции, 42Б. Начальная цена – 2 555 084,15 бел. руб. с НДС. Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов.

Телефон для ознакомления и осмотра +37529-698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 31.03.2021 г. 09.00 по 12.04.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов: не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 05.03.2021 г.

---

## Извещение о проведении 30 апреля 2021 года открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС»

| Сведения о предмете аукциона | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Местонахождение имущества** | **Площадь (кв. м)** | **Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы** | **Начальная цена права заключения договора аренды имущества (руб.)** | **Целевое использование имущества** | **Сумма задатка (руб.)** | **Наименование имущества, его характеристика, необходимые условия аренды и иные сведения** |
| г. Минск, ул. Кирова, 2-3Н | 124,0 | 3,0 | 523,90 | Под торговый объект, оказание услуг населению и иные цели, возможные для размещения на данном объекте | 52,30 | Торговое изолированное помещение. Помещение является памятником историко-культурного наследия. Имеются центральное отопление, водопровод, центральная канализация, горячее водоснабжение, электроснабжение. Необходимое условие: после заключения договора застраховать сдаваемое в аренду недвижимое имущество за счет средств арендатора в пользу арендодателя |
| ***Договор аренды заключается сроком на три года*** | | | | | | |

**Арендодатель –** ОАО «ДОРОРС», г. Минск, ул. Брестская, 77/1-2, тел. 8 (017) 240 62 06.

**Организатор аукциона –** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел. 8 (017) 360 42 22.

Аукцион состоится **30 апреля 2021 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 30 марта 2021 г. по 28 апреля 2021 г. включительно** в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в аукционе, несут лица, их подавшие.

**Порядок оформления участия в аукционе**

К участию в аукционе допускаются юридические или физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, внесшие в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на указанный текущий расчетный счет сумму задатка, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах с приложением всех необходимых документов, заключившие с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах и получившие билеты участников аукциона с указанием порядковых номеров, под которым данные лица зарегистрированы.

При этом лицо, желающее принять участие в аукционе:

*- уплачивает задаток на расчетный счет р/с BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционе от 30.04.2021;*

- подает организатору аукциона заявление на участие в аукционе (бланк заявления можно получить у организатора аукциона) с приложением следующих документов:

*юридическое лицо – резидент Республики Беларусь:*

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

копии платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

*юридическое лицо – нерезидент Республики Беларусь:*

легализованной в установленном порядке копии учредительных документов и выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иного эквивалентного доказательства юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

копии платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

*индивидуальный предприниматель:*

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

копии платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

*физическое лицо* – копии платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

- заключает с организатором аукциона соглашение, бланк которого можно получить у организатора аукциона.

При подаче заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами и заключении соглашения физическое лицо, индивидуальный предприниматель предъявляют организатору аукциона документ, удостоверяющий личность, а представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность.

**Порядок определения победителя аукциона**

Аукцион проводится в порядке, предусмотренном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 (далее – Положение).

Перед началом аукциона организатор аукциона проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в аукционе. Заключительная регистрация представляет собой замену организатором аукциона билетов участников аукциона на аукционные номера, под которыми участники аукциона будут участвовать в аукционе. После проведения аукциона участники аукциона обязаны вернуть эти номера организатору аукциона.

Аукцион проводит аукционист, определяемый организатором аукциона. Аукцион начинается с оглашения аукционистом правил проведения аукциона, шага аукциона. Шаг аукциона устанавливается аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей цены предмета аукциона, названной аукционистом.

Аукцион начинается с объявления аукционистом наименования, места нахождения, краткой характеристики недвижимого имущества, право заключения договора аренды которого выставляется на аукцион, начальной цены, срока, на который будет заключен договор аренды. После оглашения данной информации аукционист в соответствии с шагом аукциона объявляет первую цену предмета аукциона. Не допускается продажа предмета аукциона по начальной цене. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, а такой участник признается лицом, приравненным к победителю аукциона.

**Обязанности победителя аукциона (лица, приравненного к победителю аукциона):**

подписать протокол о результатах проведения аукциона в день его проведения;

в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка;

в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение (информация о затратах доводится до сведения участников перед началом аукциона);

в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона заключить с арендодателем договор аренды имущества.

Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 99 (девяносто девять) базовых величин на дату проведения аукциона.

**Дополнительная информация**

Базовая арендная величина (БАВ) с 01.04.2019 по 31.03.2022 составляет 16,90 рубля;

возможность осмотра имущества, право заключения договора аренды которого выставлено на аукцион, обеспечивает арендодатель;

организатор аукциона настоятельно рекомендует лицам, желающим участвовать в аукционе, уточнить у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований санитарных и противопожарных норм), размеры арендной платы и коммунальных платежей, а также ознакомиться с проектом договора аренды имущества;

юридические лица и индивидуальные предприниматели производят оплату задатка исключительно платежным поручением;

при отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он может быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении;

организатор аукциона в течение 5 рабочих дней со дня его проведения возвращает участникам аукциона, за исключением случаев, предусмотренных Положением, внесенные ими задатки (сумма задатка, внесенного победителем аукциона, засчитывается при оплате им стоимости предмета аукциона);

договор аренды по результатам аукциона может быть заключен исключительно с участником аукциона, ставшим победителем (приравненным к нему лицом), заключение договора аренды, целевое назначение которого предполагает осуществление предпринимательской деятельности, с субъектом, который в силу законодательства не может осуществлять названную деятельность, не допускается.

**Телефоны для справок:** отдел аукционов – +375 (17) 360 42 22, бухгалтерия – + 375 (17) 366 36 58.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – **www.mgcn.by** (раздел «Недвижимость в аренду»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «Объявления-Аукционы»).

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ВТОРОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки» г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «ТРЕСТ № 26 ЖЕЛЕЗОБЕТОНМОНТАЖ», г. Минск, 220073, ул. Харьковская, 15, +375173958917, +375293928906** |

**Предмет аукциона: капитальные строения, реализуемые одним лотом**

**Открытый склад металла № 1** (сооружение специализированное складов, хранилищ) общей площадью 10146,7 кв. м, инвентарный номер 350/С-187388, по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 254В. **Обременение: аренда**

**Здание теплопункта** (здание специализированное энергетики) общей площадью 42,9 кв. м, инв. номер 350/С-88096, по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 254. Составные части и принадлежности: отмостка

**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания открытого склада металла № 1, здания теплопункта общей площадью 1,6690 га

**Начальная цена без НДС** – 246 240,00 белорусских рублей
**Шаг аукциона** – 12 312,00 белорусских рублей

**Порядок ознакомления с предметом аукциона: осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00. Ответственное лицо: Дриневский Виктор Васильевич, тел. +375(29) 603 49 02**

**Дополнительная информация**: регистрация перехода права собственности на предмет аукциона к Покупателю будет осуществляться в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь № 63 от 05.02.2013 «О некоторых вопросах правового регулирования процедур экономической несостоятельности (банкротства)». Государственная регистрация договора купли-продажи и перехода права собственности на объекты недвижимости осуществляются Покупателем самостоятельно за свой счет

Лица, желающие принять участие в торгах обязаны внести задаток и подать организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

**Порядок оформления участия в торгах, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов определяется ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **30 (тридцати) дней** со дня проведения торгов если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору в размере 3 % от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 10.02.2021 г., на сайте ЕГРСоБ 10.02.2021 г.

**Аукцион состоится 15.04.2021 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703**

**Для участия в аукционе необходимо перечислить организатору торгов задаток, а также подать заявление с приложением всех необходимых документов в срок с 9.00 30.03.2021 до 17.00 13.04.2021 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**

**Контактные телефоны: +375 29 317-95-42; +375 44 704-92-06.**
**E-mail: auction@cpo.by**

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ»
ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **УП «Комбинат декоративно-прикладного искусства им. А.М. Кищенко»** (УНП 600126458) 222520, г. Борисов, ул. Блюхера, 19, тел. 8 025 699 20 66, в лице ликвидатора ООО «Правовая компания «Делегат».

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **30 апреля 2021 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Мельница барабанная № 1, инв. № 366 | 2 500,00 |
| 2 | Мельница барабанная № 2, инв. № 334 | 1 600,00 |
| 3 | Мельница барабанная № 3, инв. № 295 | 1 800,00 |
| 4 | Мельница шаровая, инв. № 276 | 1 400,00 |
| 5 | Мельница шаровая, инв. № 321 | 1 800,00 |
| 6 | Мельница барабанная № 4, инв. № 336 | 700,00 |
| 7 | Мешалка для гипса, инв. № 195 | 350,00 |
| 8 | Мешалка СМ-24313, инв. 293 | 500,00 |
| 9 | Центрифуга, инв. № 065 | 200,00 |
| 10 | Шкаф сушильный № 1, инв. № 197 | 300,00 |
| 11 | Шкаф сушильный № 11, инв. № 392 | 300,00 |
| 12 | Шкаф сушильный № 13, инв. № 259 | 300,00 |
| 13 | Шкаф сушильный № 14, инв. № 259-3 | 300,00 |
| 14 | Шкаф сушильный № 15, инв. № 259-1 | 300,00 |
| 15 | Шкаф сушильный № 16, инв. № 259-2 | 300,00 |
| 16 | Шкаф сушильный № 2, инв. № 198 | 300,00 |
| 17 | Шкаф сушильный № 3, инв. № 204 | 300,00 |
| 18 | Шкаф сушильный № 4, инв. № 258 | 300,00 |

**Местонахождение имущества:** г. Борисов, ул. Блюхера, 19.
Телефон для ознакомления и осмотра +37529-698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 31.03.2021 г. 09.00 по 29.04.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов: не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

## Гісторыя газеты — гісторыя моладзі

# Пра што расказала падшыўка...

**У красавіку «Чырвонай змене» (а сёння гэта яе правапераемнік — «Чырвонка. Чырвоная змена») спаўняецца 100 гадоў. У які складаны, цікавы і важны час яна нарадзілася! Беларусь толькі аднаўлялася пасля вайны, але, нягледзячы на эканамічныя цяжкасці, разруху, колькі ўвагі аддавалася станаўленню культуры, нацыянальнага друку, адукацыі, навукі. «Чырвонка» — равесніца Белдзяржуніверсітэта і Нацыянальнай бібліятэкі. Натуральна, станаўленне і дзейнасць гэтых устаноў шырока адлюстроўваліся на старонках маладзёжнай газеты. Па яе падшыўках мы можам сачыць, як будаваліся заводы, жыллё, новыя школы, бібліятэкі, клубы. Вялася барацьба з непісьменнасцю, дарэчы, да гэтай справы актыўна далучылася і маладзёжная газета (чытачы дасылалі ў рэдакцыю лісты, у якіх прызнаваліся, што па «Чырвонай змене» вучыліся чытаць). З 11 красавіка 1925 года газета друкуецца па-беларуску — і ўжо з розных куткоў рэспублікі ідуць справаздачы аб тым, як па газеце моладзь вывучае мову.**

**Але падшыўкі могуць расказаць не толькі пра маштабныя будоўлі і падзеі стагоддзя, яны адлюстроўваюць эпоху, ідэі, думкі, надзеі, мары маладых людзей. Давайце не проста зазірнём у старыя нумары «Чырвонай змены», але і спрычынімся да тых пошукаў лепшай долі хлопцаў і дзяўчат 20-х, 30-х, 40-х, 50-х... Даведаемся, як многа яны паспелі зрабіць.**

### Вясенні сюрпрыз

*«Дым, сажа і пах пораху Грамадзянскай вайны яшчэ не ўлягліся. Беларусь яшчэ «не стабілізавалася».*

*Беларускі камсамол толькі што выйшаў з падполля, пачаў распраўляцца, пашыраць сваю работу сярод мас моладзі.*

*У гэтыя дні ўжо быў неабходны друкаваны орган», —* згадваў адзін з першых супрацоўнікаў «Чырвонай змены» Барыс Кузняцоў. Халоднай зімой 1920—1921 гадоў актыў камсамола, які жыў у неацепленых нумарах гасцініцы «Еўропа», пасля дня работы (пасяджэнняў, сходаў, мітынгаў, нядзельнікаў) вечарамі абмяркоўваў характар будучай газеты, яе назву, малюнак загалоўка (разам з мастаком), як дастаць грошы, наладзіць пытанні з выпускам і распаўсюджваннем газеты. Шмат увагі аддавалася і пошуку аўтараў, і ўжо з першых нумароў у газету пайшлі шматлікія карэспандэнцыі з розных куткоў Беларусі.

Першы нумар выйшаў 21 красавіка 1921 года — да другога Усебеларускага з'езда камсамола. Газету выпускалі «ў строгім сакрэце» — хацелі зрабіць з'езду сюрпрыз. Пра выхад яе ведаў толькі прэзідыум. Хоць тайну не ўдалося схаваць, са з'езда будучыя чытачы званілі ў рэдакцыю кожныя 5-10 хвілін і цікавіліся, як друкуецца першы выпуск. А ў клубе імя Карла Маркса, дзе праходзіў з'езд, з вуснаў у вусны перадавалася вестка пра тое, што зараз прынясуць «нашу» газету...

У падшыўцы «Чырвонкі» за 1924 год у артыкуле «Як «Чырвоная змена» сарвала пасяджэнне з'езда» змешчаны успаміны пра той дзень: *«Ледзьве дачакаўшыся, пакуль машына зробіць 300 абаротаў, рэдактар хапае паўтары сотні газет і стралой, забыўшы спехам шапку і нават партфель, імчыцца у клуб. Пуляй пралятае ў калідор і, як ледзьледзь аддыхаўся, ціхенька адчыняе дзверы, каб незаўважаным прабрацца да прэзідыума.*



Рэдакцыя газеты 1926 г.

*Якое! У імгненне крэслы апусцелі, а ў дзвярэй пачынаецца бойка. Няшчасны рэдактар. На яго наваліліся адразу чалавек сто і ірвуць, і давяць, і хапаюць.*

*Разгубіўся дакладчык. Спыніўся. Дарэмна бразгае старшыня ў званочак... Адляцеў язычок у званочка. Паглядзеў на яго старшыня, плюнуў, кінуў на падлогу і, забыўшыся на ўсё на свеце, нават на строгі наказ, які даў па тэлефоне рэдактару «не ўзнімаць шуму, калі прынясеш газету», сам кідаецца да дзвярэй, уразаецца ў кучу і, выхапіўшы газету, упіваецца ў яе позіркам. За ім — увесь прэзідыум.*

*Толькі праз паўтары гадзіны, калі кожным з дэлегатаў з'езда была прачытана газета «ад дошкі да дошкі», пасяджэнне аднавілася».*

### Твар «Маладзёжкі»

*«Чырвоная змена» нарадзілася і на ўсё жыццё засталася з цудоўным вясеннім тварам — таго юнака з факелам, які ў былыя гады красаваўся каля загалоўка газеты... Гэты малюнак быў характэрны для тых, прапахлых дымам Грамадзянскай вайны, дзён. Тады камсамольцы хадзілі з галоднымі зморанымі тварамі, з ружжамі, што прыхінуліся да халоднага чорнага срэбра скураных куртак.*

*У цяжкіх матэрыяльных умовах, выходзячы на жоўтай абгортачнай паперы, «Чырвоная змена» крычала ўсяму Саюзу, што час — грошы, што трэба «вучыцца агранамічным ведам», «падняць прадукцыйнасць працы», «палепшыць сваю кваліфікацыю», «умацаваць шэфства над флотам».*

*І такой — дзелавітай, заўсёды энергічнай — прыйшла «Чырвоная змена» да свайго 5-гадовага юбілею.*

*«Цяпер вясенні твар нашай газеты глядзіць з лозунгаў за эканомію, якасць і новы быт»,* — так у красавіку 1926 года газета дае першую святочную справаздачу перад чытачамі.

Са штотыднёвіка з тыражом у 200 экзэмпляраў за пяць гадоў «Чырвоная змена» вырасла ў газету, якая выдаецца праз дзень, з тыражом у 10 тысяч 500 экзэмпляраў. Уведзены шэраг пастаянных аддзелаў: міжнароднага жыцця, жыцця працоўнай моладзі, Чырвонай Арміі, піянеры, жыцця вясковай моладзі. Толькі пачаў працаваць і новы аддзел мясцовага жыцця, які асвятляе не толькі камсамольскую работу, але і дзейнасць Інбелкульта і літаб'яднання «Маладняк», гаспадарчых органаў, судовыя справаздачы, дае паведамленні пра здарэнні. Сюды, у аддзел, набралі маладых аўтараў, для якіх гэтая работа ў газеце — першы журналісцкі вопыт.

Між іншым, з заметак у «Чырвоную змену» ці дасланых туды вершаў пачыналі многія паэты і празаікі. Так, сюды дасылалі свае першыя спробы пяра Пятрусь Броўка, Пятро Глебка, Мікола Хведаровіч, Паўлюк Трус. «Маладняккоўцы» Алесь Дудар, Анатоль Вольны, Адам Бабарэка, Міхась Чарот, Андрэй Александровіч таксама супрацоўнічалі з «Маладзёжкай».

*«Рэдакцыйныя работнікі павінны яшчэ больш уважліва, больш старанна ўчытвацца ў кожную заметку, востра сачыць як за дакладнасцю думак, так і за пісьменнасцю моладзі, памятаць, што на заметках моладзь вучыцца жыць і працаваць, а карэспандэнты вучаца, як у далейшым пісаць»,* — заўважаў Куртык, які ў 1926 годзе рэдагаваў газету.

### Вялікая вада

Пра тое, што аўтарытэт газеты з кожным годам павялічваўся, сведчыць рост яе тыражу. Так, у 1931 годзе ён складае ўжо 33300 экзэмпляраў, і газета ставіць амбіцыйныя задачы павялічыць яго да 60 тысяч. Дзесяцігоддзю «Чырвонкі» маладыя людзі прысвячаюць свае працоўныя подзвігі (у гэты час па краіне праводзяцца сацыялістычныя спаборніцтвы), ствараюць новыя ўдарныя брыгады і ладзяць «чырвоназменаўскі» набор у камсамол.

Толькі святкавання ў красавіку не адбылося (яго перанеслі на 10 мая). Больш за тое, часова быў спынены выхад газеты.

*«Зацяжная зіма з вялікімі снегавымі завеямі, рэзкае пацяпленне ў апошнія дні, як і трэба было чакаць, выклікалі хуткае раставанне снегу і вялікі разліў рэчак. Гэты разліў пагражае псаваннем шляхоў зносін, нармальнай рабоце прамысловасці. Камсамольцы, чырвонаармейцы і рабочыя заводаў у барацьбе з разводдзем»,* — пісала газета.

21 красавіка 1931 года Свіслач выйшла з берагоў. Старажылы казалі, што такога страшнага разліву не было ўжо 40 гадоў. Вада пацякла па Садовай, Беларускай, Татарскай, Садова-Набярэжнай, Пуліхавай Слабадзе, Клябанаўскім завулку і іншых вуліцах. У Серабранцы яна б знесла мост, калі б не самаадданая праца моладзі (300 камсамольцаў латала пралом каля моста, так збудаванне ўдалося «вырваць з рук стыхіі»).

Пачаліся праблемы з электрычнасцю. Вада наступала на электрастанцыю. *«Па шыі ў вадзе, рабочыя ўзнімалі маторы, гераічна змагаючыся са стыхіяй... Спыніўся з-за непадачы току і рад прадпрыемстваў».*

*«Увесь камсамольскі актыў завода «Камунар» у колькасці 260 чалавек мабілізаваны на барацьбу з паводкай. Тры змены ў дзень гераічна абараняюць завод.*

*76 камсамольцаў напагатове. Яны ахоўваюць маторы, машыны і рухавікі. Круглыя суткі 35 камсамольцаў рамантуюць мост (наладжваючы пераправу насельніцтва).*

*Машыны, маторы, рухавікі выратаваны. Аднак усе цэхі завода ў вадзе. Камсамольцы даюць прыклад змагання са стыхіяй. Агульны сход рабочых пастанавіў: дні прастою заводу адпрацаваць, каб ударнымі тэмпамі нагнаць прапушчанае».*


Падпісная кампанія 20-х.

**Падрыхтавала Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Свята-Раства-Багародзіцкая царква

Касцёл Унебаўзяцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі (руіны)

*в. Дубравы, Маладзечанскі р-н*

# «ПАГЛЯДЗІ Ў НЕБА...»

## З дзённікавых занатовак



**1962.** Навокал вясновае разводдзе, нібы пачатак патопу. На возе мяне і сястру Валю бацькі вязуць у Дубравы ў царкву, каб пахрысціць. Нашы будучыя хросныя — бацькаў брат Славік і маміна сястра Аля — трымаюць нас на руках, як жывых лялек. Мне хоць і пайшоў трэці год, але я раву, як рэзаны. Бацька злуецца: «Вот ты, Ніна, выдумала нейкую язду ў царкву. Прывезлі б дахаты папа — і ўсё было б, як трэба...» Усе маўчаць, а я раву. Недзе там за гарою царква...

**1965.** На Радаўніцу з бабуляй Ганнай адведалі ў Крывічах магілку майго дзеда Міхася. Я, як толькі можа пяцігадовы хлапчук, дапамог бабулі з грудка вырваць траву і пасыпаць яго свежым жоўтым пясочкам. Падфарбавалі агароджу, паклалі каля крыжа некалькі велікодных яек. Дачакаліся бацюшку, які хадзіў па могілках і чытаў за памерлых малітвы. І толькі сабраліся ісці дахаты, як раптам наляцеў моцны вецер і наўкол пацямнела. Загрымеў першы вясновы гром, узляцелі з дрэў, як сухое чорнае лісце, вароны. «Пабеглі хутчэй дамоў!..»— занепакоіўся я, але бабуля ўзяла мяне за руку і спакойна павяла ў царкву. У Храме было шмат людзей і светла...

**1972.** З бацькам на возе еду ў Гарадок здаваць агрэст. Па дарозе распытваюся, дзе і што, і чаму ўсё так, а не іначай. Бацька ў добрым настроі, і таму расказвае з ахвотай пра ўсё на свеце. Праязджаем каля могілак. Маглі б проста праехаць, але бацька спыняе каня і вядзе мяне на могілкі паказаць, дзе і хто пахаваны з нашых блізкіх. У самім Гарадку спыняемся каля рэштаў Храма, і тут бацька мяне заводзіць у сцены царквы і кажа: «Паглядзі ў неба...» Я гляджу, і ён пытаецца: «Што бачыш?» — «Неба...» — адказваю я. «А ў небе?» Я маўчу, а бацька кажа: «А там Бог...»

**1973.** У школе я добра бегаў, і мяне павезлі на спаборніцтвы ў Ракаў. Прабег нядрэнна. Да аўтобуса дахаты было яшчэ шмат часу, і нам дазволілі пабадзяцца па мястэчку. Наш фізрук некуды сышоў, старэйшыя хлопцы пайшлі піць «чарніла», а я застаўся адзін. Куды пайсці? І я пайшоў у царкву, каб паслухаць, як мяне вучыла бабуля, Божаньку. Зачынена. Перайшоў дарогу — далей за хатамі бачыўся высокі прыгожы касцёл. Падышоў да яго. Дзверы адчынены. Заходжу, а там змрочна, і конь з возам, з якога людзі згружаюць нейкія вялізныя мяшкі. Едучы дамоў, пра сваю вандроўку па Ракаве я расказаў фізруку, які на мой аповед усміхнуўся: «У касцёл у мяшках прывезлі новых грэшнікаў, і цяпер усю ноч будуць з іх малоць муку. Будзеш грашыць, і цябе змелюць...»

**1985.** Аднойчы ў інтэрнат Літінстытута да мяне зайшоўся зямляк, паэт Валерый Казакоў. Пагаварыўшы пра жыццё-быццё, ён прапанаваў: «Паехалі да мяне ў госці. Я цябе хоць пакармлю нармальнай ядой...». Жыў Валера недзе далёка на ўскраіне Масквы. Перад тым як ехаць да яго на кватэру, ён вырашыў прайсціся са мной па вуліцах вячэрняга горада. Ішлі доўга, і я думаў, што Валера мяне вядзе ў нейкі рэстаран. А прыйшлі ў царкву. Зямляк купіў свечкі, і мы іх запалілі за нашу Беларусь. Дома, пачаставаўшы, Валера даў мне пачытаць перад сном Біблію. На той час святыя кніжкі былі рэдкасцю, і я зачытаўся да гадзін двух ночы. Хацеў заснуць, але не змог — у галаве круціліся словы: «И всё это суета сует и томление духа под солнцем...» У пяць гадзін раніцы апрануўся і, нічога не сказаўшы Валеру, паехаў да сябе ў інтэрнат...

**1986.** У падмаскоўны Загорск у Сергіеву лаўру я ездзіў на святыя святы. Апошнім разам паехаў з Людмілай. І якраз трапілі, што некалькі дзён таму там быў вялікі пажар — гарэлі келлі манахаў. Залатыя купалы Храмаў, пачарнелыя ад дыму сцены манаскага будынка, чорныя вялікія вароны на яшчэ чорных голых дрэвах і манахі ў чорным, як цені з мінулага, і мая Людміла сярод усяго гэтага, як Рагнеда...

**1987.** Сястра Валя папрасіла мяне быць хросным бацькам яе сына. Я згадзіўся, і мы паехалі ў Ракаў у царкву. Людзей у Храме не было. І бацюшка, пасля таго як атрымаў, што яму на той дзень Бог паслаў, пацікавіўся: «Як будзем хрысціць немаўля: па поўнай праграме ці па скарочанай?» Майму швагру якраз не выпадала расцягваць святую працэдуру на невядомы час, і ён згадзіўся на «кароткую праграму». Гадавалы Сярожа роў у мяне на руках, а я кусаў губы, каб не засмяяцца, успомніўшы недзе вычытанае: «Харашо гарланіць. Відаць, камсамольскім важаком будзе...»

**1989.** У які горад ці мястэчка ні прыеду, першае, што хочацца ўбачыць і куды схадзіць — гэта Храм. Пасля чарговага «Свята паэзіі ў Ракуцёўшчыне» госці са сталіцы, і ў тым ліку я, ідуць па дарозе да электрычкі. Зайшлі ў царкву, каб паставіць свечкі па Максіме Багдановічу. Следам за намі заляцела сінічка, і пакуль мы былі ў Храме, лётала пад купалам...



**1992.** Упершыню Дуброва, ці, як у нас прынята гаварыць, Дубравы, згадваецца ў летапісах у 1453 годзе, калі тут Глябовічамі быў фундаваны касцёл. У 1576 годзе на месцы старога касцёла Мікалай Крыштоф Радзівіл Сіротка ўзвёў новы, у 1787 годзе той згарэў. Адам Хмара, тайны саветнік і ваявода мінскі, розных польскіх і расійскіх ордэнаў кавалер, які з 1791 года стаў новым уладаром мястэчка Дуброва, у 1796 годзе заснаваў на месцы раней існуючых драўляных касцёлаў, на пагорку, новую мураваную святыню ў стылі класіцызму пад тытулам Унебаўзяцця Найсвяцейшай Марыі Панны. Пасля падаўлення паўстання 1863—1864 гг. касцёл быў закрыты, у 1868 годзе яго перабудавалі пад праваслаўную царкву. У 1919 годзе будынак святыні вярнулі католікам. У чэрвені 1948 года касцёл закрылі, а ў 1949 годзе ён перададзены Дуброўскаму спіртзаводу пад склад і з часам ператварыўся ў руіну. Сцены касцёла і сёння стаяць на ўзгорку, як напамін пра тое, што яшчэ не ўсё страчана...

У Дубравах на рэштках Храма ў канцы васьмідзясятых, відаць, каб прыцягнуць увагу да разбуранай святыні, нехта фарбай напісаў: «Тут хрысцілі Янку Купалу!». Але і гэты святы падман не ўратаваў сцен Храма...

**23.05.2010.** У Навасёлкі знаёміцца з траюрадным дзядзькам Леанідам Жыткевічам, які цяпер на пенсіі і ў вольны час малюе, давялося ехаць аднаму — Людміла падпрастыла, а сын Максім паехаў з аднакласнікамі ў Тальку на экскурсію. Анатоль Блашчыцын — мой далёкі сваяк — уляцеў у электрычку на Маладзечна за хвіліну да адпраўлення. Усю дарогу прагаварылі, таму гадзіна язды праляцела незаўважна. У Дубравах нас ужо чакаў Леанід на машыне. Побач стаяў нейкі дзіўны трактар, за рулём якога сядзеў стары. Да яго залезла пажылая кабета з электрычкі, і яны паехалі. Леанід паведаміў, што гэты трактар чалавек змайстраваў сам. Яму цяпер 77 гадоў. Па дарозе ў Навасёлкі спыніліся каля Дубраўскай царквы, дзе якраз ішла служба, — Анатоль захацеў пакінуць памінальныя запіскі. У царкве было каля дзесяці чалавек. Збудаванне драўлянае. На ўваходзе вісіць шыльда: «Беларуская Праваслаўная царква ў імя Нараджэння Прасьвятой Багародіцы. Адноўленая ў 90-х гадах 20-га стагоддзя стараннямі свяшчэнніка Іаана Крупко». Святар у Дубравах вядомы і як паэт. Асобныя яголыя вершы краязнаўца Міхась Казлоўскі дапамог надрукаваць у маладзечанскіх газетах. У Храме шмат ікон. Многія тканыя. У канцы службы ў царкву была занесена шырокая сіняя лава — пачалася падрыхтоўка да адпявання памерлага. Памёр пяцідзесяцітрохгадовы Руды з Навасёлак. Леанід не змог успомніць, як яго завуць. Адстаяўшы да канца службу, мы працягнулі сваю дарогу...

**16.07.2011.** Па дарозе з Мінска ў Маладзечна ў раёне Драздоў колькі разоў мы з Людмілай бачылі новы Храм. І вось сёння мы выбраліся пагпядзець на яго зблізку. Выходзілі з дому пры пагодзе, а па дарозе трапілі пад дробны дождж, які ўсё ж нас не напалохаў. Храм цяпер рамантуецца, з яго зняты пазалочаны купал, які тут жа каля Храма ляжыць у траве, як шалом велікана. Агледзеўшы царкоўныя збудаванні, мы пайшлі да святой крыніцы, дзе на жалезным мастку маладажонамі падчас вяселля начэплена на шчасце некалькі дзясяткаў замкоў. Пасля наведання царквы і малітвы замкі на мастку мне падаліся паразітамі, якія харчуюцца жалезнымі мастамі...

**2012.** Жывучы ў цешчы каля Кальварыйскіх могілак, калі было сумна, з Людмілай хадзіў да магілы Янкі Лучыны. Час ад часу заглядалі і ў касцёл. Не маліліся, бо праваслаўныя, а проста стаялі і слухалі малітвы. Цяпер на Кальварыйскія могілкі ходзім і да Вячаслава Адамчыка, і да Алеся Пісьмянкова, і да Алеся Траяноўскага, і да Алеся Асташонка, і да Яўгена Куліка...

**29.05.2013.** Каля Храма лётае тапаліны пух, нібыта грэшныя душы мітусяцца...

**28.04.2016.** У Храме, як у акамянелым небе...

**9.12.2016.** У Храме-помніку ў гонар Усіх святых адбылася ўрачыстая цырымонія «Вяртанне» — закладка капсулы з зямлёй з месца пахавання Максіма Багдановіча. Была ганаровая вайсковая варта. Было шмат прадстаўнікоў духавенства, дзяржаўнай улады, творчай інтэлігенцыі, навукоўцаў, супрацоўнікаў музеяў, бібліятэк, студэнтаў і проста добрых людзей. Адчувалася, што мы сёння зрабілі яшчэ адзін крок да беларускай Беларусі, пра якую марылі лепшыя прадстаўнікі нашага народа. Пасля ўрачыстасцяў у Белай зале Храма адбылася літаратурна-музычная імпрэза «Калі ўсе мы разам ляцім да зор...». Выходзячы з Храма, падумалася: «Вось так бы адзначаліся ўсе юбілеі нашых славутых людзей!» З сённяшняга дня для мяне ў Храме Усіх святых будзе цэнтр маёй Беларусі, бо там часцінка Максіма Багдановіча.

**9.08.2017.** Прыйшоў з работы. Прылёг і заснуў. Снілася мора. Я ішоў па беразе і прыйшоў у нейкі незнаёмы горад. Захацеў спытацца, а няма ў каго. Зайшоў у Храм. Змрочна. Запаліў свечку, і навокал стала светла-светла. І я прачнуўся. У акно свяціла вечаровае сонца. Побач з ложкам драмала сабака, а ў другім пакоі спаў сын, які ўчора прыехаў з войска ў адпачынак. Праз гадзіну прыйшла з работы Людміла і прынесла для нас торт.

**15.02.2018.** Раніцай быў у царкве. Набываў грамнічныя свечкі. Ішла служба. Амаль усе старыя жанчыны і мужчыны, што былі спінамі да мяне, былі падобныя на маіх маму і тату.

**Віктар ШНІП.**

Землякі



# ПЕРШЫ Ў СВЕЦЕ...

## «...У жалеза ўвайшла душа яго»



**КАЛІ севастопальскі ўрач Мікалай Пірагоў залажыў асновы ваенна-палявой хірургіі, то ўрач-беларус Віктар Буйневіч у свае 29 гадоў паклаў пачатак новай галіне ваенна-марской медыцыны — падводнай хірургіі.**

Гэту падзею так і не занеслі ў кнігу сусветных дасягненняў. Але ў ёй, у гэтай кнізе, і без таго нямала белых плям...

Такім чынам, ваенны ўрач, капітан медыцынскай службы Віктар Іванавіч Буйневіч першы ў свеце зрабіў поласцевую аперацыю мараку на падводнай лодцы, якая ішла на глыбіні 150 метраў пасярод Атлантычнага акіяна. Гэта адбылося ў кастрычніку 1962 года ў разгар так званага Карыбскага крызісу, калі ЗША абвясцілі аб марской блакадзе Кубы, а савецкія падводныя лодкі выйшлі на абарону нашых танкераў і сухагрузаў, якія ішлі ў кубінскія парты. Пентагон сцягнуў у Карыбскае і Саргасава моры амаль увесь свой велізарны атлантычны флот. СССР змог супрацьпаставіць яму чатыры дызельныя падводныя лодкі, узброеныя атамнымі тарпедамі. Свет павіс на валаску. У гэтым сусветным перадапакаліпсісе, у д'ябальскай карыдзе авіяносцаў, фрэгатаў і падводных лодак павісла на валаску і жыццё асобнага чалавека — мічмана-акустыка падводнай лодкі Б-36 Пятра Панкова. Яму пагражаў перытаніт, а значыць, патрабавалася тэрміновая поласцевая аперацыя.

Як усё было?.. А было вельмі млосна, невыносна горача і вільготна. У энергетычных адсеках тэмпература паветра даходзіла да 60 градусаў. У гэтай пякельнай сауне вахтавыя часам страчвалі прытомнасць, і тых, хто атрымаў цеплавы ўдар, выносілі ў больш «прахалодныя» канцавыя адсекі, дзе паветра было прагрэта «ўсяго» да 35-40 градусаў. Сцякаючы потам, падводнікі насілі на шыі ручнікі, каб выціраць мокрыя твары. Глыток выпітай вады тут жа выпараўся праз поры...

Медыцынская аперацыя на падводнай лодцы сама па сабе — ужо экстрым, і немалы. Аперацыя ў варожых водах, калі лодку шукаюць чужыя караблі і грукочуць падводныя выбухі сігнальных гранат, калі ў адсеках смурод, спёка, пот і ніякіх антысептыкаў — гэта экстрэмальна ўдвая.

Для ўрача падводнай лодкі 641-га праекта (тып «факстрот») не прадугледжана нават малой каюткі. Адзінае месца, куды можна пакласці хворага, — абедзенны стол у афіцэрскай кают-кампаніі. Але перш чым гэта зрабіць, Буйневіч добра працёр стальніцу спіртам, а затым разаслаў стэрыльную прасціну. Спіртам апрацавалі і ўсё памяшканне, усе пераборкі...

* * *

Паклалі мічмана, зафіксавалі рукі і ногі на выпадак раптоўнага нахілу, ды і каб сам не тузануўся, калі раптам перапыніцца дзеянне наркозу. Тут новая бяда: спецыяльна падрыхтаваны матрос ад віду крыві, якая выступіла з-пад скальпеля, страціў прытомнасць. Падаваць інструменты стала няма каму. Да стала ўстаў капітан-лейтэнант Сапараў, зампаліт; ён не ведаў дакладных назваў хірургічных інструментаў, і Буйневіч паказваў поглядам, што яму падаць. Каб не знепрытомнець, афіцэр паднасіў да носа бутэлечку з нашатырам, а далоні час ад часу акунаў у слоічак са спіртам.

Падчас аперацыі і Буйневічу, і Сапараву давялося надзець белыя халаты — адчуванне было такое, як быццам увайшоў у сауну ў кажусе. Халаты наскрозь прамоклі ад поту... За бортам тэмпература вады звыш 30 градусаў. Пад палубай жылога адсека, дзе разгорнута аперацыйная, — акумулятарная батарэя, якая, калі разраджаецца, дае цяпло, ды пры гэтым яшчэ вылучае вадарод. Гэты выбухованебяспечны газ спальваецца ў спецыяльных электрычных печках, якія таксама працуюць, дадаючы ў агульную спёку свае градусы.

Панкоў пакладзены на стале, рукі і ногі прышпілены спецыяльнымі рамянямі, яго злёгку падманваюць, запэўніваючы, што гэта неабходна для штурмавога мацавання.

— Зваліўся, потым збірай тут цябе па частках, — з перабольшанай заклапочанасцю бурчыць Буйневіч. — На, выпі!

— Што гэта? — небяспечна прынюхваецца матрос. — Спірт?

— Пі, каб «мама» не крычаў!

Акрамя ўсіх праблем, узнікла яшчэ адна: у Панкова непераноснасць навакаіну, а іншых сродкаў абязбольвання ў аптэчным арсенале ўрача няма. Прыйдзецца рэзаць пад мясцовай замарозкай, а гэта больш чым адчувальна. Перад тварам мічмана вывешваюць марлевую фіраначку, каб не бачыў нічога лішняга...

* * *

З дзённіка хірурга:

«Зрабіў касы надрэз па Валковічу-Дзьяканаву даўжынёю сантыметраў у сем. Тут жа «заліставаў» электракаагулятарам перарэзаны сасудзік з двух бакоў, каб не сыходзіў крывёй. Прыбраў тампонам крою, якая набегла.



На гэтым стале была зроблена аперацыя.

«Калі хворага добра зафіксаваць, — як жартуе наш флагманскі ўрач, — то апераваць можна і без наркозу. Па Малюце Скуратаву». І яшчэ ён павучае маладых хірургаў: «Чырвоненькае сшываецца з чырвоненькім, а беленькае — з беленькім». Жарты жартамі, але мясцовае абязбольванне пры такой аперацыі — гэта катаванне. Якая безабаронная чалавечая плоць перад вострым металам... Як адчайна супраціўляецца скура, як упіраюцца фасцыі мышцаў. Але... Сталь мацнейшая.

Такім чынам, скура рассечана, а разам з ёй і падскурная тлушчавая клятчатка. Доступ у поласць жывата адкрыты. Гэта як лаз у акумулятарную яму... (Параўнанні з лодкавай машынерыяй прыходзяць на розум самі па сабе. Напэўна, пасля даволі ўедлівага вывучэння «матчасткі».) Шлях да адростку перагарадзілі фасцыі касой мышцы, і я перарэзаў іх нажніцамі, затым, рассунуўшы тканкі (яны лёгка разышліся ў бакі), адкрываю шлях у глыбіню. Цяпер трэба рассячы брушыну паміж зацiскамі... Госпадзі, праняслі!.. Да чаго ж арганізм падобны на механізм — ну проста трубаправод нейкі, толькі жывы і вельмі адчувальны...

— Балюча?

— Балюча, — шчыра прызнаецца мічман з-за фіранкі.

— Трэба яшчэ трошкі пацярпець.

— А можна я буду спяваць?

— Спявай.

— Урачу не здаецца наш горды «Вараг»!..

Старадаўняя марацкая песня-малітва худа-бедна, але дапамагае...

У рэшце рэшт, Панкова выносяць і асцярожна ўкладваюць на ніжні ложак у афіцэрскай каюце-чатырохместцы. Цяпер самае галоўнае — правільнае выходжванне. Але паспрабуй выхадзі хворага ва ўмовах брудных тропікаў!»

* * *

Памочнік камандзіра падводнай лодкі капітан-лейтэнант А. Андрэеў успамінаў:

«Ад спёкі, поту, бруду ва ўсіх пайшлі па скуры гнайнічкі. Доктар Буйневіч змазвае іх «зялёнкай». Ходзім размаляваныя, як індзейцы. Я перайшоў на «трапічны рацыён»: у абед — толькі шклянка кампоту. На вячэру якую-небудзь малочную кашу і кампот. Вячэрні чай — толькі шклянка доўгачаканай вільгаці. Ніякая ежа ў рот не лезе.

Зараз ноч. Ледзь павеяла свежым паветрам. Людзі хапаюць яго, як рыбы ў зімовы мор — шырока адкрытымі ратамі. Бедны доктар Буйневіч! Ён нават не можа вымераць тэмпературу хвораму. У адсеках няма месца, дзе тэмпература была б ніжэй за +38 °С. Тэрмометры зашкальваюць. Вочы «лезуць з арбіт». Ад духаты расколваецца галава. Прайшоў па адсеках — нікога, акрамя вахтавых, якія яшчэ трымаюцца. Усе ў насавым або кармавым, дзе трошкі прахалодней. Але і ў гэтых адсеках надыхалі так, што вуглекіслаты вышэй за ўсякія нормы. Ніхто не сыходзіць. Лёг і я ў абдымку з тарпедай. Яе жалеза ледзь халадзіць. Свабодныя ад вахтаў сядзяць, не варушачыся, гледзячы ў адну кропку. На вахту ўжо не ідуць, а паўзуць. Тэмпература ў канцавых адсеках перавысіла +50 °С, а ў дызельным, электраматорнай і двух акумулятарных адсеках — за +60 °С. Вахтавыя страчваюць прытомнасць... Сёння ўпалі ад цеплавога ўдару яшчэ трое матросаў...»

* * *

З успамінаў штурмана Б-36 старшага лейтэнанта В. Навумава:

«Урач на падводнай лодцы — гэта хадзячая клініка: ён і хірург, і тэрапеўт, і ўролаг, і гігіеніст, і дыетолаг, і траўматолаг, і нават дантыст. І яшчэ. На лодцы доктар — не толькі ўрач, але і афіцэр, ды яшчэ падводнік. Адзіны ў трох асобах — ваенна-марскі ўрач. Па лодачным раскладзе, ён, акрамя ўсяго іншага, — камандзір другога адсека. Па баявой трывозе ён застаецца старэйшым у другім адсеку і выконвае ўсе загады цэнтральнага паста, узначальвае барацьбу за жывучасць у выпадку пажару або затаплення. Для гэтага трэба ведаць адсек, вывучыць яго зверху данізу, дзе якія кабельныя трасы праходзяць, дзе якія «пакетнікі» стаяць, як усякаюцца або высякаюцца батарэйныя аўтаматы, як уключаецца сістэма пажаратушэння і многае іншае. Але ёсць яшчэ і вышэйшы «доктарскі пілатаж». Гэта не ўваходзіць у прамую «функцыяналку» начальніка медслужбы. Але калі ён здаў залікі на самастойнае нясенне якарнай вахты, а таксама вахты на бочцы або на швартовых, не кажучы ўжо пра дзяжурства па караблі, гэта значыць, узяў на сябе частку чыста службовай руціны, падставіў сваё плячо пад агульную лямку, тады яго будуць не проста паважаць, а шанаваць і ганарыцца ім. Вось тады ты ў дошку свой хлопец, паўнапраўны член афіцэрскага братэрства».



Экіпаж Б-36.

* * *

А пацыент Буйневіча, мічман Панкоў, праз некалькі дзён стаў на ногі. Хірургічная рана зажыла, і мічман вярнуўся ў рубку акустыкаў. Да таго часу Б-36 трапіла ў звышвострую сітуацыю: неадступнае сачэнне амерыканскіх караблёў прывяло да таго, што ні разу не атрымалася ўсплыць на зарадку акумулятарных батарэй. Цяпер жа, пасля даклада механіка, што «электраліт разрадзіўся да вады», трэба было ўсплываць. Усплылі і трапілі ў шчыльнае акружэнне фрэгатаў і эсмінцаў Атлантычнага флоту ЗША. Бліжэй за ўсіх знаходзіўся фрэгат «Сесіл».

Камандзір Б-36 капітан 2-га рангу А. Дубіўка ўспамінаў:

«Падчас зарадкі батарэі мы прадумвалі розныя варыянты адрыву ад супрацьлодкавых сіл. Я выклікаў начальніка радыётэхнічнай службы старэйшага лейтэнанта Жукава і старшыну гідраакустыкаў мічмана Панкова і сказаў ім: «Для вас, хлопцы, задача асаблівая — настроіць гідраакустычную станцыю «Свіяга» на частату работы ГАС «Сесіла». Калі дам каманду на адрыў, уключыце станцыю на кругавое выпраменьванне, каб «забіць» работу гідраакустыкі «Сесіла», а мы будзем адыходзіць на максімальную глыбіню апускання».

Гідраакустыкі справіліся з гэтай задачай. Адрыў вырашылі выканаць у дзённы час, выкарыстоўваючы фактар раптоўнасці. Падчас зарадкі батарэі я неадлучна знаходзіўся на мастку. Зарадка скончана. І вось надышоў момант ісціны: чарговая група верталётаў паляцела ад лодкі на дазаправку, другая ж яшчэ не прыляцела. «Ну, — думаю, — была-не была. Трэба паказаць амерыканцам, што мы нават у гэтых нечалавечых умовах здольныя процідзейнічаць іх нахабным правакацыям у міжнародных водах». Камандую: «Тэрміновае апусканне!». Праз некалькі секунд на вачах у збянтэжаных амерыканцаў Б-36 схавалася ў безданях Саргасава мора. Даю поўны ход электраматорамі і апускаюся на глыбіню 200 метраў, паднырнуўшы пад супрацьлодкавы карабель «Сесіл». У гэты час нашы гідраакустыкі некалькі разоў па 5-6 секунд «забівалі» работу гідралакатара амерыканскага карабля кругавым выпраменьваннем сваёй станцыяй «Свіяга». Гэтая акалічнасць і вялікая глыбіня апускання забяспечылі паспяховы адрыў ад супрацьлодкавых сіл амерыканцаў. Змяніўшы свой курс на 180 градусаў, мы канчаткова адарваліся ад праследу».

Вось так спатрэбіўся выратаваны доктарам Буйневічам пацыент — майстар ваеннай справы мічман Пётр Панкоў!

* * *

У снежні 1962 года ўсе чатыры падводныя лодкі вярнуліся ў Палярны. Камандзір прадставіў лодачнага ўрача, капітана медслужбы Буйневіча да ордэна. Але наверсе вырашылі — малады яшчэ, хай паслужыць. І Буйневіч служыў, і яго жыццёвым крэда былі словы паэта-франтавіка: «Не трэба ордэна, была б Радзіма...»

Мне толькі аднойчы давялося сустрэць Віктара Іванавіча ў якасці галоўнага доктара санаторыя Паўночнага флота «Аўрора» ў Хосце. Я прыбыў туды зімой па пуцёўцы, ведаць бы тады, што за чалавек узначальваў гэту ўстанову, якую ахоўваў Бог. Але не ведаў, як не ведалі і ўсе іншыя адпуснікі-адпачывальнікі, як, напэўна, не ведаў і ўвесь медперсанал «Аўроры»...

Затое з яго сынам Дзмітрыем Віктаравічам, які пайшоў па слядах бацькі, у мяне завязалася перапіска:

«Бацька ў мяне беларус, жыў на акупаванай тэрыторыі ў вёсцы Любішына Чэрвеньскага раёна, гэта Мінская вобласць. Расказваў, што калі суседнюю вёску спалілі немцы, яны з сям'ёй уцяклі ў лес і доўга там жылі...

Ён увесь час быў у рабоце, і я нават не памятаю, калі мы, папросту кажучы, валяліся, адпачывалі, гультаявалі. Ён увесь час знаходзіўся ў нейкім руху, верагодна, гэта было ўласціва ўсяму яго пакаленню... Таму пакаленню, якое прайшло праз горан вайны і ведала цану і працы, і хлебу, здабытаму гэтай працай...

Службу бацька скончыў у Сочы — у чыне падпалкоўніка медыцынскай службы. Памёр ён на 78-м годзе жыцця — 31 кастрычніка 2013 года...»

Вось, уласна, і ўся гісторыя, і не занесеная ў сусветную кнігу рэкордаў...

**Мікалай ЧАРКАШЫН.**

БЕЛАРУСБАНК

# ПУБЛИЧНАЯ ОФЕРТА (ПРЕДЛОЖЕНИЕ)

## на изменение порядка определения размера процентной ставки дохода, начисляемой по срочным банковским вкладам в долларах США

1. ОАО «АСБ Беларусбанк» предлагает изменить порядок определения размера процентной ставки дохода, начисляемой по указанным в настоящей публичной оферте (предложении) срочным банковским вкладам в долларах США (далее также – порядок). В соответствии с данным порядком по срочным вкладам в долларах США:

«Классик Отзывный свыше года» на срок 18 месяцев;

«Интернет-депозит-Тренд Отзывный» на сроки 18 и 23 месяца;

«Классик Безотзывный свыше года» на сроки 13, 18, 30 и 36 месяцев;

«Интернет-депозит-Тренд Безотзывный» на сроки 18 и 23 месяца, по которым проценты начисляются исходя из переменной годовой процентной ставки, где базовым показателем является ключевая ставка Федеральной резервной системы США, с 2 апреля 2021 года проценты будут начисляться исходя из следующих размеров процентной ставки в абсолютном числовом выражении:

«Классик Отзывный свыше года» на срок 18 месяцев – 0,3 % годовых;

«Интернет-депозит-Тренд Отзывный»:
на срок 18 месяцев – 0,35 % годовых;
на срок 23 месяца – 0,4 % годовых;

«Классик Безотзывный» свыше года:
на срок 13 месяцев – 1,6 % годовых;
на срок 18 месяцев – 1,61 % годовых;
на срок 30 месяцев – 1,62 % годовых;
на срок 36 месяцев – 1,63 % годовых;

«Интернет-депозит-Тренд Безотзывный»:
на срок 18 месяцев – 1,62 % годовых;
на срок 23 месяца – 1,63 % годовых.

2. Условия, изложенные в пункте 1 настоящей публичной оферты (предложения), применяются:

- в отношении вкладов, по которым не начисляется пониженная процентная ставка в соответствии с условиями соответствующего договора срочного банковского вклада в долларах США;

- в период (периоды), в течение которого (которых) размер переменной годовой процентной ставки, определяемый в соответствии с условиями соответствующего договора срочного банковского вклада в долларах США, будет ниже размера процентной ставки в абсолютном числовом выражении, определяемого в соответствии с предлагаемым порядком.

Условия, изложенные в пункте 1 настоящей публичной оферты (предложения), не применяются:

в период (периоды), в течение которого (которых) размер переменной годовой процентной ставки, определяемый согласно условиям соответствующего договора срочного банковского вклада в долларах США, будет равен либо выше размера процентной ставки в абсолютном числовом выражении, определяемого в соответствии с предлагаемым порядком;

- с даты начисления процентов по пониженной процентной ставке по соответствующему договору срочного банковского вклада в долларах США.

3. В случае перерасчета начисленных процентов по вкладу по пониженной процентной ставке согласно условиям соответствующего договора срочного банковского вклада в долларах США в аналогичном порядке производится перерасчет процентов, начисленных в соответствии с условиями пункта 1 настоящей публичной оферты (предложения). Данный пункт действует бессрочно в отношении договоров срочного банковского вклада в долларах США, к которым применялся порядок, закреплённый в пункте 1 настоящей публичной оферты (предложения).

4. Акцептом настоящей публичной оферты (предложения) является получение вкладчиком процентов по вкладу, в том числе начисленных и выплаченных по вкладу в соответствии с настоящей публичной офертой (предложением).

5. Настоящая публичная оферта (предложение) не вносит изменений и не излагает в новой редакции условий, закреплённых в соответствующих договорах срочного банковского вклада в долларах США. При этом в случае её акцепта в период её действия условия настоящей публичной оферты (предложения) имеют приоритет перед условиями соответствующих договоров срочного банковского вклада в долларах США.

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 11.01.2019, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.*

# ОАО «Нафтан»

## РЕАЛИЗУЕТ НА КОНКУРСНОЙ ОСНОВЕ (с повышением начальной цены) бывшее в употреблении неиспользуемое имущество:

| Пометка на конверте | Наименование | Инв. № | Год ввода в эксплуатацию | Начальная цена без НДС, руб. РБ | Начальная цена с НДС, руб. РБ |
|---|---|---|---|---|---|
| Реализация неликвидов, Нафтан, 29.04.2021 | Плотномер DM-230.2 | 08158045 | 2009 | 2523,00 | 3027,60 |
| | Плотномер DM-230.2 | 08158046 | 2009 | 2523,00 | 3027,60 |
